Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 гр.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата напрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 1 — Вільня, Субота 14-га красавіка 1928 г. — Год 1

У гэтым нумары 6 страніц.

Што паказалі выбары.

У № 8 „Народу“ „воргану“ Янкі Станкевіча зьмешчана перадавая стацьця, дзе „спадары“ з „Народу“ пытаюцца, „чаму так сталася, што беларусы не правялі сёлета ў Сойм 35 паслоў“.

І, не знаходзячы сабе адказу, вінаваціць у гэтым неправядзеньні якісь інтэрнацыянальны беларускі кірунак. У канцы стацьці гаворыцца, што „народную справу ўзялі ў свае рукі ідэйныя (?!) беларускія сілы, якія згуртаваліся каля сьпіску „Беларускіх сялян і работнікаў“, на чале якога стаяў, як ведама, Янка Станкевіч.

Тут мы і хочам глянуць на выбары так, як яны фактычна адбыліся і зьвярнуць увагу на тое, чаго „спадары“ з „Народу“ ня хочуць бачыць і перад другімі зацямняюць.

* * *

Выбары ў Заходняй Беларусі адбываліся як па пісанаму, загадзя абдуманаму пляну. У-ва ўсім гэтым пляне далося заўважыць адно—зусім выразнае—гэта касаваньне беларускіх сялянска-работніцкіх радыкальных сьпіскаў, з якімі толькі—аднымі—паважна і лічыліся. А што толькі з імі і трэба было лічыцца, гэта паказваюць рэзультаты выбараў.

Вось тут і разгледзім, як беларусы прайшлі ў Сойм.—Прайшлі яны ў трох выбарных акругах і па трох розных сьпісках: у Лідзкай выбарнай акрузе — па сьпіску „Беларускіх сялян і работнікаў“; у Сьвянцянскай выбарнай акрузе — па сьпіску „Нацыянальных Меншасьцяў“, дзе йшлі беларускія сельсаюзнікі і хадэкі, спрогшыся з нямецкай і жыдоўскай буржуазіяй і ў Наваградзкай выбарнай акрузе—па сьпіску „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“.

Дарогі-ж і спосабы, якімі здабыты па гэтых сьпісках мандаты—розныя.

Яшчэ да выбараў было відаць, што казённыя беларусы—гатунку Паўлюкевіча і Умястоўскага на выбарах праваляцца, а тымчасам „хлебадаўцам“ казённыя беларусы былі дазарэзу патрэбны ў Сойме. І вось-жа на месца Паўлюкевіча і Умястоўскага і быў створаны сьпісак „Беларускіх сялян і работнікаў“, на чале якога стаў Янка Станкевіч. — Выставіў ён свае сьпіскі ў трох выбарных акругах: Лідзкай, Сьвянцянскай і Наваградзкай. Па Лідзкай выбарнай акрузе, па якой йшоў сам „спадар“ Янка Станкевіч, скасавалі ўсе радыкальныя беларускія сялянска-работніцкія сьпіскі, — навет сьпісак „Нац. Меншасьцяў“. Тут для нашага „спадара“ рашчысьцілі дарогу і навет пясочкам пасыпалі. Разважалі „спадары“ палажэньня так: няма ніводнага беларускага сьпіску, дык будуць сяляне галасаваць за Янку Станкевіча.

І засыпаў тады Янка Станкевіч беларускіх сялян цэлай паводкай перадвыбарнай літэратуры. Але хутка пераканаўся, што селянін наш за-надта сьвядомы, каб паддаўся ашуканству;—пераканаўся,—што за ім—Янкай — беларускае сялянства ня йдзе.

Тады пусьціўся ён на рашучы крок: падшыванства. Карыстаючыся тым, што беларуская радыкальная прэса, запраўды баронячая інтарэсы сялян і работнікаў, у часе выбараў сьвету ня бачыла з прычыны сыстэматычных канфіскацыяў, і дзеля гэтага сяляне не маглі ведаць аб запраўднай выбарнай сытуацыі, — Янка Станкевіч выдаў газэту „Бацькаўшчына“,—якая вонкавым выглядам была схожа з беларускімі радыкальнымі газэтамі, што выходзілі і выходзяць на Віленскай вул. 12.—Мала таго,—у „Бацькаўшчыне“ пісаў „спадар“, што гэта газэта рэпрэзэнтуе „Грамаду“ і што за ёю йдуць бышыя грамадзісты. (Сам Янка Станкевіч, пакольні нам ведама, ніколі да бышай „Грамады“ не належаў). — Словам—разьлічвалася на несьвядомасьць беларускіх працоўных гушчаў. Было пушчана ў ход усе, — мэта апраўдывае срэдзтвы.

Пэўная мэта была асягнута: пры гэткіх способах „агітацыі“ і тых абставінах, у якіх адбываліся выбары (аб чым ведае кожны выбаршчык), са сьпіску „Беларускіх сялян і работнікаў“ прайшлі ў Сойм два паслы на чале з Янкам Станкевічам.

Вось якім шляхам прайшоў у Сойм Янка Станкевіч.

У Лідзкай-жа выбарнай акрузе было пададзена больш за 70 тысяч (!) „няважных“ галасоў—гэта значыць—галасоў за скасаваныя беларускія сялянска-работніцкія сьпіскі (бо не за блёк-жа „Нацыянальных Меншасьцяў“, аб чым можна судзіць па непасьпехах „блёку“, што відаць з іншых выбарных акругаў,—аб чым скажам ніжэй).

Сьвянцянская-ж выбарная акруга была аддадзена „Сельсаюз-Хадэцы“, бо йзноў-жа радыкальныя беларускія сялянска-работніцкія сьпіскі былі пакасаваны.

Тут тое-ж шчасьце, што і ў Лідзкай акрузе для Янкі Станкевіча; іншых беларускіх сьпіскаў няма, дык хочаш-няхочаш беларускі селянін галасуй за сьпісак „Нац. Меншасьцяў“, дзе йдуць беларускія „Сельсаюз-Хадэкі“. У дадатак вялася вусная агітацыя, што з „Нац. Меншасьцямі“ йдзе бышая „Грамада“. Даведацца-ж праўду аб выбарах беларускаму селяніну было немагчыма, з прычыны сыстэматычнай канфіскацыі радыкальнай беларускай прэсы і ўсей прадвыбарнай літэратуры.

Дзякуючы такому стану рэчы, „Сельсаюз-Хадэкі“ правялі ў Сьвянцянскай акрузе трох паслоў.

У іншых-жа выбарных акругах, дзе засталіся беларускія радыкальныя сялянска-работніцкія сьпіскі, нашыя мяшчане з-пад знаку „Сельсаюз-Хадэцыя“ не правялі ані воднага пасла. — Горадзенская выбарная акруга, можа, найбольш паказальная аб уплывах „Сельсаюз-Хадэцыі“:—там за блёк „Нац. Меншасьцяў“ галасавала толькі жыдоўскае насельніцтва, абаламучанае сваею буржуазіяй,—у гмінах-жа з чыста-беларускім насельніцтвам ані воднага голасу не пададзена за сьпісак „Нац. Меншасьцяў“: галасавалі сяляне там за радыкальныя сялянска-работніцкія сьпіскі, якія ня былі скасаваны.

Ці-ж гэта не гаворыць аб „уплывах“ „Сельсаюз-Хадэцыі“ ў нашай вёсцы?

Найярчэй і найбольш пераконываюча гавораць аб улывах і сіле беларускіх палітычных напрамкаў вынікі выбараў у Наваградзкай акрузе. — Тут беларускія сьпіскі ня былі касаваны.— Зразумела,—з аднаго боку разаб'юцца беларускія галасы, а з другога—відаць пасьля выбараў, хто запраўды мае ўплыў у нашай вёсцы. У гэтай акрузе ня быў скасаваны беларускі радыкальны сялянска-работніцкі сьпісак „Змаганьне за інтарэсы сялян і работн.“, сьпісак, які запраўды бароніць інтарэсы сялян і работнікаў; далей — быў сьпісак „Нац. Меншасьцяў“, сьпісак Чатырка — Янк.-Станкевічаўскі,—сьпісак Міткевіча, Паўлюкевіча і інш.

Пачалася выбарная агітацыя, — выбарная дэмагогія ўсіх іншых партыяў, апрача „Змаганьня за інтарэсы сялян і работнікаў“, бо ня толькі адозвы „Змаганьня“, але навет газэты, якія пасьмелі хоць-бы рэклямаваць гэты сьпісак, сыстэматычна канфіскаваліся.

І што-ж? — Сьпісак „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“ дастаў галасоў чуць не на чатэры мандаты (да чацьвертага мандату не хапала галасоў 200). Іншыя-ж беларускія сьпіскі не дасталі ані воднага мандату: — беларускія працоўныя гушчы пераступілі цераз „Сельсаюз-Хадэцыю“, Чатырку з Янкай Станкевічам ды Міткевіча з Паўлюкевічам, і пайшлі за сваімі запраўднымі барацьбітамі са сьпіску „Змаган. за інтарэсы сялян і работнікаў“ і за іх аддалі свае галасы.

Рэшту мандатаў у гэтай акрузе дастала адзінка.—Чаму?—Чаму ня ўсе дастала „Змаганьне за інтар. сял. і работ.“ (на гэта яно бязумоўна мела і мае права)? На гэта тут баімося даваць адказ, але думаем, што кожны сьвядомы селянін, бачыўшы, як рабіліся выбары,—ведае, чаму гэта сталася так.

Ці-ж гэта не паказвае, хто мае ўплывы ў нашай вёсцы?—Ці гэта не паказвае, што вёска наша йдзе шляхам працоўных і пераступае цераз усіх падшыванцаў і наймітаў капіталістаў, йдучы да свае мэты — агульнага ідэалу працоўных!

Відаць з вышэй пададзеных фактаў, што „Сельсаюз-Хадэкі“ і Янка Станкевіч прайшлі ў Сойм дзякуючы тым абставінам, якія былі створаны ў іхніх акругах. Калі-ж бы ў Лідзкай і Сьвянцянскай акрузе ня былі скасаваны радыкальныя беларускія сялянска-работніцкія сьпіскі, то ані „Сельсаюз-Хадэкі“ ані Янка Станкевіч ня бачылі-б пасольскіх мандатаў, як ня бачыць ім сваіх вушоў: — усе-б галасы палі на сьпіскі працоўных (як гэта і сталася ў Наваградзкай акрузе).

Настрой нашай вёскі—гэта настрой працоўных масаў. І запраўднымі прадстаўнікамі нашых вясковых працоўных гушчаў зьяўляюцца толькі паслы, прайшоўшыя па сьпісках працоўных, і якія злучаюцца ў клюбе „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“—ў складзе: — д-р Іг. Дварчанін, Яз. Гаўрылік, Стагановіч і Грэцкі (які прайшоў у Берасьцейскай акрузе па сьпіску ўкраінскай Сель-Роб. лявіцы). За імі толькі і пойдуць беларускія працоўныя гушчы, іх голасу паслухаюць.

Прыходзіцца чуць, што Беларусы на выбарах разьбіліся, падзяліўшыся на розныя напрамкі, мы-ж кажам, што гэта ня праўда, бо аб разьбіцьці на выбарах ня судзім па разьбіцьці інтэлігенцыі, якая, як бачым, убольшасьці не разумее народу,—а судзім па тым, ці *народ* разьбіўся на выбарах, — народ-жа, як відаць з вышэйшага, йшоў на выбары адзіным фронтам — фронтам працоўных. А што не правялі ліку паслоў, адпавядаючага настрою і ліку беларускіх працоўных масаў, то вінаваты ў гэтым тыя абставіны, у якіх адбываліся выбары і разьбівачы ў родзе Я. Станкевіча.

Мы лічым, што беларускія працоўныя масы з выбараў вышлі з перамогаю, бо аб перамозе на выбарах (пры тых абставінах, у якіх адбываліся яны) мы судзім не па ліку праведзеных паслоў, а па ліку галасоў, пададзеных на сьпіскі працоўных. Мы, разам з працоўнымі масамі, чуемся пераможнікамі—пераможнікамі перадусім духова і маральна і гэта нам дае сілы і ахвоты да далейшай працы.—Мы горды і рады, што разумеем народ, а народ—нас,—што разам з працоўнымі іншых нацыяў куем лепшую долю беларускага працоўнага народу.

* * *

Дык цяпер, можа і „Народ“ Янкі Станкевіча зразумее, што „беларусы не правялі 35 паслоў“ таму, што такія былі выбарныя абставіны,—не без дапамогі Я. Станкевіча і яму падобных. А чаму яны былі такія,—хай спытае „Народ“ у тых, дзякуючы каму прайшоў у Сойм сам Янка Станкевіч.

Польска-літоўская канфэрэнцыя.

2/IV адбылося другое і апошняе паседжаньне пленуму польска-літоўскай канфэрэнцыі—пад чарговым старшынствам мін. Залескага.

31/III і 1/IV працавалі камісіі—над праектамі ўмоваў і праграмай агульнага паседжаньня дэлегацыяў.

Польская дэлегацыя, як ужо ведама чытачом, апрацавала 4 праекты. Першы з іх кажа—„аб малым суседзкім камунікацыйным руху ў пасе мытнай лініі — на прасторы на 30 кілям. у кожны бок“. Польская дэлегацыя ўмысна ўжывае выраз „мытная лінія“ замест „граніца“, каб не дражніць літвіноў, што, як сцьвярджаюць карэспандэнты і што падчыркнуў сам Вальдэмарас зрабіла добрае ўражэньне на літоўскую дэлегацыю. 3 другія праекты—звычайныя ўмовы нармальнага зацьверджанага міжнароднымі канфэрэнцыямі тыпу—датычаць чыгункавай, паштова-тэлеграфнай і транзытнай камунікацыі.

З свайго боку літоўская дэлегацыя высунула 2 праекты. Першы з іх датычыць адшкадаваньняў за страты, прычыненыя акцыяй ген. Жэлігоўскага, якіх літоўскі ўрад налічыў аж на—10 мільёнаў даляраў зьлішкам; другі праект, гэта—трактат, гарантуючы нятыкальнасьць Літвы з боку Польшчы. У справе абодвух літоўскіх праектаў—яшчэ да пленарнага паседжаньня — абедзьве дэлегацыі здолелі абмяняцца сьцягам цікавых нотаў.—На першую літоўскую ноту—з праектам адшкадаваньняў—польская дэлегацыя адказала, што прынцыпова прымае праект—за падставу для перагавораў, але засьцерагае сабе права ўнясьці контр-праект—аб адшкадаваньнях з боку Літвы за страты, прычыненыя Польшчы—зламаньнем нэйтралітэту літоўскім войскам у часе вайны Польска-Бальшавіцкай у 1920 г.

На гэта літоўская дэлегацыя зараз-жа адказала другой нотай, адхіляючы рашуча гэтую засьцярогу. Нота падчырківае, што Літва на гэтай канфэрэнцыі абмяжавалася толькі справай адшкадаваньняў за акцыю ген. Жэлігоўскага, не нарушаючы ўсяго складу прэтэнсіяў сваіх да Польшчы, якія—значна шырэйшыя, чым справа грашавых адшкадаваньняў. Другі літоўскі праект, як падаюць газэты, дамагаецца асаблівых гарантыяў бясьпечнасьці літоўскай тэрыторыі з боку Польшчы, якая, як цьвердзіць літоўская нота, праз увесь час „належала да найбольш зацятых ворагаў Літвы, дый толькі ў апошнім сьнежні заявіла ўрачыста, што ня хоча нарушаць сувэрэннасьці Літвы“. (тэл. А. Г. Е.). Далей нота закідае Польшчы, быццам яе ўрад арганізуе ўсьцяж банды з літоўскіх эмігрантаў, якія падрыхтоўваюць напад на Літву. Дзеля таго літоўская дэлегацыя прапануе стварыць 2 мяшаныя камісіі: для скантраляваньня на мейсцы „небясьпекі з боку літоўскіх бандаў“, і—для праводзеньня дэмілітарызацыі прыгранічнага пасу.

Урэшце дэлегацыі дагаварыліся ў справе праграмы супольнага паседжаньня дэлегацыяў, якое і адбылося 2/IV. Першым пунктам другога пленарнага (агульнага) паседжаньня было ўсталеньне праграмы канфэрэнцыі, другім—агульная дыскусія ў справе прадстаўленых з абодвум бакоў праектаў, трэцім—стварэньне суадказных камісіяў для апрацаваньня згодных праектаў.

Адчыніўшы паседжаньне, мін. Залескі

запратэставаў перадусім проці таго, што літоўская дэлегацыя — замест публічнага абгаварываньня ўсіх справаў, вядзе іры помачы нотаў—сэкрэтную церапіску, што супярэчыць агульна прынятым спосабам перагавораў, аб публічнасьці якіх абедзьве дэлегацыі дагаварыліся згары. Дзеля таго ён запрапанаваў першым чынам—апублікаваць усе высланыя дагэтуль дэлегацыямі адна адной ноты.

У сваей адказнай прамове Вальдэмарас падрабязна разьбіраў жэнэўскую рэзалюцыю і сьцяг іншых адносных актаў, датычачых польска-літоўскай спрэчкі. У выніку гэтых разважаньняў Вальдэмарас сьцьвярдзіў, што Літва мае ўсе правы лічыць сябе зусім вольнай у вырашэньні віленскага пытаньня, якое і надалей астаецца „адчыненым" (гэта значыць: нявырашаным).

Пераходзячы да разгляду і крытыкі высунутых польскай дэлегацыяй праектаў, Вальдэмарас заявіў, што некаторыя з іх, вырашаючы справы тэхнічных стасункаў, зачапляюць а часам і вырашаюць і пытаньні палітычнага зьместу, якія Літва ня лічыць магчымым абгаварываць на гэтай канфэрэнцыі. У канцы ўсё-ж Вальдэмарас запрапанаваў, каб асобныя камісіі разглядзелі прадстаўленыя праекты.

Мін. Залескі з свайго боку зараз жа згадзіўся на прапазіцыю.

Пасьля гэтага былі створаны 3 камісіі: эканамічная, якая зараз-жа зьбярэцца ў Варшаве, гаранцыйная, якая будзе працаваць у Коўні, і — гранічнага руху, якая паедзе ў Бэрлін. 20 красавіка старшыні ўсіх камісіяў зьбяруцца ў Бэрліне. На гэтым пакуль што і скончылася ўся канфэрэнцыя. Калі яна зьбярацца іэноў—для прадаўжэньня распачатай працы, здаецца, неназначана.

Ці—з таго ўсяго, што ўжо адбылося на канфэрэнцыі, можна судзіць аб канчальным пасьпеху перагавораў, цяжка сказаць. Наагуль — „выключыць палітычны мамэнт" з узаемных зносінаў дзьвюх дзяржаваў, пакінуўшы ў іх нейкім чынам адсэпараванымі „выключна-тэхнічныя адносіны", — гаспадарча-камунікацыйныя,—задача, трэба думаць,—вельмі цяжкая, калі наагул не немагчымая. Аб гэтым выразна кажа і гутарка Вальдэмараса з карэсп. Нямецк. Тэлегр. Агенства. Найбольш цікаўным і новым мамэнтам у перагаворах зьяўляецца літоўскае дамаганьне адшкадаваньняў за акцыю ген. Жэлігоўскага дый тое, што Польская дэлегацыя „прынцыпова згадзілася на разважаньне гэтай справы", што асабліва падчырківае і гутарка мін. Залескага з карэспанд. „Кур. Варш.". таго-ж 1 красавіка, як азнаку вялікай уступчывасьці з боку Польшчы".

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

15-ты дзень працэсу. Першымі даюць свае паказаньні сьведкі: Амельяновіч, Бочкэвскі, Кірэй, Кейзік, М. Астроўская, якія ня ўносяць нічога новага да справы.

Сьв. Шчурэвскі, кам. пал. з Слабодкі, быў пры рэвізіі ў п. Валошына, якая адбылася ў Сакольцы ў памешканьні Бочковскага, гдзе пасол затрымліваўся. Успамінае пра авантуру, якая мела месца надчас пав. зьезду Грамады, на якім былі паслы Тарашкевіч і Валошын. На пытаньні абароны нічога канкрэтнага сказаць ня можа, мае слабую памяць, навет ня можа сказаць, калі была зьліквідавана Грамада.

Сьв. Белянскі, пал., быў на мітынгу ў Кляшчэлях, на якім прамаўляў пас. Валошын. Прысутных было 300 асоб. Кажа, што пасол казаў аб сацыяльнай рэвалюцыі, аб урадзе Пілсудскага, які душыць беларускі народны рух, называў ксяндзоў і папоў паліцыянтамі. Аб Грамадзе, як партыі, казаў, што дамагаецца яна наданьня зямлі сялянам, асьветы ў роднай мове. Аб адарваньні Зах. Беларусі ад Польшчы нічога не казаў.

Абарона задае пытаньні, ці Валошын паведаміў улады аб мітынгу, ці гэта быў мітынг пасольскі, ці чуў яшчэ хто яго прамову? Сьведка нічога не памятае.

Падсуд. Валошын: ці сьведка не памятае, як я ў 12 гадз. паведаміў пана, што будзе справаздаўчы мітынг? Сьв. Не, памятую толькі, што пан прышоў на пастарунак і шумна захоўваўся.

Старшыня суду Аўсянка: сьв. казаў у сьледчага судзьдзі, што Валошын паведаміў пана аб мітынгу.

Сьв. Боровскі, ст. пшод. апісвае мітынг пас. Валошына ў Гарадку, які адбыўся ў кастрычніку 1926 г. і на якім было прысутных каля 400 асоб. У прамове сваей Валошын называў польскую канстытуцыю правам белага тэрору, а дзяржаўны лад Польшчы—будынкам на курыных ножках. Пракурораў і судзьдзяў называў катамі, якія мыюць свае рукі ў беларускай крыві. Прыпомніў факт, калі адзін пракурор сфальшаваў дату, каб закуць аднаго вязьня-беларуса.

Сьв. Лапата войт — паказвае, што ў сувязі з узростам Грамады залягалі падаткі. Успамінае, што на вясну 1927 г. мела быць паўстаньне і што ўжо былі вызначаны беларускія ўлады, як напр. на ягонае месца нейкі Мацкевіч. Але ніякіх непарадкаў, як актыўныя выступленьні, у яго воласьці ня было.

Адв. Гонігвіль: ад каго пан чуў, што Мацкевіч быў выбраны войтам і што будзе паўстаньне?

Сьв. Чуў, цікавіўся.

Сьв. Мінковскі, канфідэнт Бельскага пав., доўга затрымліваецца над працай Грамады і КПЗБ. Кажа, што на абшары Белавежскай пушчы было 15 гурткоў і адна камуністычная ячэйка, якую арганізавалі Вашкевіч і Пісарэўскі — грамадаўцы. На адным з пасеџжаньняў ячэйкі праектавалася забойства ген. Ст. Балаховіча. Выканаць яго меўся пачаткава бандыт Бойка, а пасьля грамадаўцы Паўла і Антон Шпаковічы. Першы пад імем Рамановіча быў выключаны з ліку сяброў Грамады, але толькі фікцыйна, каб яго ўчынак ня кінуў плямы на ўсю арганізацыю Грамады. Забойца меўся зьявіцца ў Цэнтральны Сакратарыят у Вільні, дзе атрымаў-бы 300 зл. за сваю работу. Усе перагаворы за пасярэдніцтвам Вашкевіча вёў Бурэзвіч.

Пасьля пытаньняў абароны высьвятляецца, што ўсе гэтыя весткі паходзяць ад Вашкевіча, які і цяпер знаходзіцца на волі, ў той час, калі яго супрацоўнікі арыштаваны. Сьведка ня можа вытлумачыць таксама, чаму Шпаковіч і Рамановіч маюць адзначаць адну і тую самую асобу.

Адв. Гонігвіль просіць суд запатрэбаваць з Беластоцкага Акружнога Суду акты справы Шпаковічаў, якія датычацца арганізацыі забойства ген. Балаховіча. Суд згаджаецца.

Сьв. Настаровіч і Русі нічога новага да справы ня ўносяць.

Сьв. Пожэра, канфідэнт Бельскага пав., бадаў у сваім часе Унушынскага, які быў на зьездзе, скліканым б. пас. Валошыным у Бельску. Зьезд не адбыўся і Валошын арганізаваў толькі канфэрэнцыю мужоў даверра. Раздаваў ім бібулу. Па выхадзе з памешканьня, дзе адбываўся сход, Унушынскага арыштавалі. Пры ліквідацыі Грамады зроблена 106 рэвізіяў і ў 15 выпадках знойдзена камуністычная літэратура, якая паходзіла ад паслоў Валошына і Мятлы. Пасьля пытаньняў абароны выясьняецца, што сьведка ня памятае зьместу адозваў, што Унушынскі быў арыштаваны не па выхадзе з памешканьня, а пасьля.

Падсуд. Мятла заяўляе, што апрача зьезду ў Ст. Беразове ён ніколі ня быў у Бельскім павеце.

Сьв. Погожэцкі, канфідэнт, бадаў сяброў Грамады ў Беластоку. Кажа агульнікова аб разьвіцьці Грамады, паўтараючы больш-менш тое, што і ўсе канфідэнты.

Сьв. Полеўчак, пшод. кажа аб зьездзе ў Ст.-Беразове, які адбыўся ў сьнежні 1925 г. На зьездзе былі прысутнымі б. паслы Валошын і Мятла. Упушчалі некаторых асоб, якія ня мелі сяброўскіх білетаў. Авантура паўстала ўнутры памешканьня. Мятла страляў.

Падсуд. Тарашкевіч—хто мог быць прысутным на зьездзе?

Сьв.—хто меў білеты.

Падсуд. Мятла—ці сьведка быў прысутным на зьездзе?

Сьв.—быў.

Мятла—ці сьведка не памятае, як звонку пачалі кідаць каменьні і ламаць дзьверы?

Сьведка замінаецца... і кажа, што ламалі і звонку. Мятла — асьвядчае Суду, што сьведка гавора няпраўду.

Сьв. Шунайла і Семашка не дадаюць нічога новага.

Сьв. Жукевіч—быў пры рэвізіі ў б. пасла Валошына, якая адбылася ў кватэры пасла ў Саколцы надчас ліквідацыі Грамады. Забралі валізу і на пастарунку ў прысутнасьці камэнданта адамкнулі. Знайшлі 42 камуністычныя адозвы ў некалькіх мовах. У сувязі з гэтым суд пастанаўляе адчытаць пратакол рэвізіі.

Адв. Гонігвіль проці адчытаньня, тлумачучыся тым, што паліцыя бяз судзьдзі сьледчага ня мела права рабіць рэвізіі, а тым больш у памешканьні пасла, які ў той час карыстаўся з нятыкальнасьці. Па нарадзе суд адчытвае пратакол.

Валошын асьвядчае, што яму быў чытаны іншы пратакол, у якім была мова аб двух знойдзеных у валізе рэвальверах, аб якіх цяпер не ўспамінаецца—дзе ж гэта праўда?

Сьв. Унушынскі, б. старшыня гуртка ў в. Касьцяніцы. Прыяжджаў на зьезд скліканы Валошыным у Бельску. Ад Валошына атрымаў дзьве газэты і тры „Маланкі", у якіх паліцыя пры рэвізіі знайшла камуністычныя адозвы. Прызнаецца, што надчас баданьня ў паліцыі ён біты.

Пасьля пытаньняў абароны высьвятляецца, што не мундуровы паліцыянт выняў у яго перад рэвізіяй літэратуру, атрыманую ад Валошына, прачытаў, узяўшы яму ў кішэнь і пасьля казаў рабіць рэвізію.

Сьв. Самойла працаваў ад 1922 г. у беларускіх часопісях. Нехта зьмяняў зьмест яго артыкулаў. Жаліўся аб гэтым Луцкевічу, які, аднак, ня будучы рэдактарам, нічога нарадзіць ня мог. Аб Луцкевічу кажа, што ён і цяпер трымаецца сваіх даўнейшых поглядаў, якія меў, будучы сябром Беларускае Сацыял. Грамады. Ня раз пісаў спраставаньні, што да Бел. Сял.-Раб. Грамады не належыць, што наагул палітыкай ад 1922 г. не займаецца дзеля прычын ідэалёгічных і слабага здароўя.

16-ты дзень працэсу 23./III.

Сьв. Барысэвіч Н. запісаўся ў Грамаду ў верасьні 1926 г. Быў выбраны старшынёй пав. гуртка ў Стоўпцах. Рэкамэндаваў Акінчыц. На паветовым зьездзе былі прысутнымі Мятла, Сабалеўскі і Акінчыц. Апошні выясьніў, што Грамада не дамагаецца адарваньня Зах. Беларусі ад Польшчы і далучэньня да Усходняй. Большая частка сяброўскіх складак адсылалася заўсёды ў Вільню ў Цэнтральны Сакратарыят. Сябрам ураду паветовага гуртка належалася месячная пэнсія, але выплачывалася вельмі нерэгулярна і з Цэнт. Сэкр. ён, як старшыня, атрымаў толькі адзін раз 190 зл. Да гуртка належалі некалькава маладых і старыя. Складкі былі розныя: ад 1 і да 8 зл.

Сьв. Бушкевіч — заст. кам. пав. у Навагрудку, апісвае маніфэстацыю ў Карэлічах (6./XI. 1926 г.). У сувязі з ёй былі арыштаваны Гоцько Клаўдыя, Кузьміч, Трусэвіч, Шаўка, Лазарэвіч і іншыя, усе — сябры Грамады. Гоцька і Кузьміч былі хутка звольнены.

Сьв. Янкоўскі Янка, паходзіць з Дамбровы Гурнічай, вызвалены, уступіў у Грамаду ў 1926 г. і быў аж да ліквідацыі. Кажа аб нейкай паперы з Цэнтр. Сэкр., якой усе сябры Грамады заклікаліся да баявой гатоўнасьці, Грамада ўзбраялася. Сам быў пры хаваньні аружжа ў Ярэмічах (12 карабінаў, некалькі рэвальвэраў). Пераканаўшмся ў тым, што Грамада была партыяй антыдзяржаўнай, пачаў безінтэрасоўна мальдаваць паліцыі. Паведаміў яе і аб схаваньні аружжа, якога, аднак, не знайшлі. Што з гэтым аружжам сталася далей, сьведка ня цікавіўся.

Адв. Сьтяроўскі: пан працаваў ідэёва, будучы польскім патрыётам і ня цікавіўся, дзе падзелася схаванае аружжа? Сьведка не адказвае. На некалькіх пытаньнях абароны, сьведка раптам пераскочыў на колішняе забойства Гурына і пачаў даводзіць, што Гурын быў забіты тым самым аружжам, якое было схавана ў Ярэмічах. Даведаўся-ж аб гэтым ад фурмана, які, перавозячы ноччу нейкую пачку з аружжам, палічыў праз дзюркі колькі і якое было аружжа і прызнаў, што гэта было ярэмічаўскае аружжа... Нейкім дзівам узяў адтуль рэвальвэр забойца Гурына. Старш. Суду на просьбу абар. Гонігвіля сцьвярджае, што сьведка ў судзьдзі сьледчага не ўспамінаў аб ніякай паперы з Цэнт. Сэкр. і паказаў, што пры закапваньні аружжа ён прысутным ня быў, а даведаўся ад іншых.

Сьв. Крыт Алякс. быў сэкрэтаром паветовага гуртка ў Несьвіжы. Інструкцыі і праграмы атрымоўваў з Цэнт. Сэкрэт. Ніякай лучнасьці з камуністамі ня было, б. пасол Сабалеўскі казаў нішчыць усё, што паходзіла ад камуністаў.

Адв. Мацьяш: ці заклікала Грамада да адарваньня ад Польшчы?

Сьв. Ніколі.

Сьв. Крэзэс, канф. на падставе выведаў кажа, што абв. Кузьміч Янка, старш. пав. гурт. у Навагрудку, вёў акцыю аб адарваньні Зах. Беларусі ад Польшчы. У судзьдзі сьледчага казаў, што Кузьміч утрымліваў сувязі з камуністамі за пасярэдніцтвам нейкага Краўца, які часта пераходзіў граніцу. Цяпер ад гэтага адмаўляецца, бо, як выясьнілася, сам Кравец ня бачыў, а ведае аб пераходзе ім граніцы ад іншых канфідэнтаў. Абв. Кузьміч асьвядчае, што ніякіх стасункаў з Краўцом не меў.

Канфідэнты Паднісі і Міляі нічога канкрэтнага да справы не ўносяць.

Сьв. Высоцкі, грамадавец, атрымаў у канцэлярыі паветовага гуртка Грамады ў Стоўпцах літэратуру, паміж якой аказаліся, пры рэвізіі, дзьве камуністычныя адозвы ў польскай мове. На пытаньні абароны выясьняецца, што сьведка сам ня ўзяў гэтую літэратуру з канцэлярыі, якая ніколі не замыкалася, дзеля чаго камуністычныя адозвы лёгка магалі быць падкінуты.

Сьв. Васільлеўскі—сьцьвярджае, што Місьевіч належаў да камуністычнай партыі, а на паўстаньні Грамады арганізаваў гурткі, будучы адначасна асабістым сакратаром былога пасла Сабалеўскага. Свае падозраньне аб належнасьці Місьевіча да камуністычнай партыі апірае на тым, што бачыў Місьевіча ў блізкіх адносінах з камуністам Парфімовічам, засуджаным за сваю камуністычную дзейнасьць. На пытаньні абароны выясьняецца, што Місьевіч у справе Парфімовіча як абвінавачаны не фігураваў і што яго зараз-жа звольнілі з арышту прык. Калапскі, як зусім ня вінаватага.

Сьв. Судніх—войт Мірскае воласьці апірае свае паказаньні аб шкадлівай дзейнасьці Місьевіча на інфармацыях, якія яму давала паліцыя. Аб тым, каб Грамада намагалася не плаціць падаткаў ён ня чуў ніколі, а тым больш аб адарваньні ад Польшчы.

17 дзень працэсу. Адв. Дурыч просіць суд пакінцаць сьведкаў, якія не зьявіліся на гэты дзень, а паказаньні якіх могуць мець вялікую вагу.

Сьв. Паўловіч Марыя працавала ў 1926—27 г. у Белар. Банку. Бугальтэрам быў Коўш, які прыходзіў у Банк штодзень. Р. Астраўскі, дырэктар Банку, працаваў звычайна ў Банку ад 1—3 гадз. Апэрацыі праводзілі супольна дырэктар, бугальтэр і касір; ніхто

„Студэнская Думка" —

часопіс беларускага студэнства, № 2 (9). сакавік — красавік, год IV, Вільня, 1928 г., стар. 32 in 8°.

Як ужо вядома з прэсы, выйшаў з друку № 2 у гэтым годзе „Студэнскай Думкі", органу беларускага студэнства ў Вільні. Зьмест — верш А. Б. „25. III. 18—25. III. 28, артыкул—„25. III. 1918—25. III. 1928." ст. ст., „Узгадаваньне характару" Ст. Грынкевіча, легенда „Над Нёмнам" Ст. Ст., вершы Бартуля, Шырана, Тулейкі, Васілька і Вялецкага, „З народнай творчасьці", Бібліяграфія, „Балючая справа" — увага Г. Вялецкага аб спорце і хроніка.

Хацелася-б, наколькі можна, больш застанавіцца над часопісьсю, якая выяўляе думку маладога пакаленьня беларускай інтэлігенцыі, хацелася-б прыглядзецца, чым жыве гэтая моладзь.

У вадной з радыкальных беларускіх газэт дана кароткая ацэнка № 1 гэтай часопісі, у якой з увагі на тое, што амаль увесь нумар заняты быў артыкуламі правага студэнства з Прагі,—канстатавалася брак думкі наагул у віленскага беларускага студэнства. Наш нумар зьмяшчае творчасьць толькі віленцаў. Гэта яўная адзнака, што студэнства даволі ўважна прыслухоўваецца да голасу старэйшага грамадзянства. Дзеля гэтага ня можна абмежыцца адной кароценькай заметкай з паказаньнем дрэнных бакоў часопісі, трэба, паказаўшы гэтыя дрэнныя бакі, паказаць і добрае, што ў ёй ёсьць і ўрэшце — паказаць, чым павінна быць падобная часопісь.

Пачнём з вершаў, як і ў самай часопісі. Добра наагул, што вершы зьмешчаны і ў даволі значным ліку. Пры ўмовах нашага жыцьця ў Зах. Беларусі ўсе паэты пачынаюць „сваю кар'еру" ў газэтах, куды прыймаюцца вершы „на тэму дня", вымагаючы гэтым самым і паэтаў кіравацца гэтымі „тэмамі". Пасьля ня вельмі добрай памяці „Родных Гоняў"—„Студ. Думка" ёсьць адзіная пакуль часопісь (як чутно, хутка будзе выходзіць, замест „Р. Г." новая часопісь), якая дае прастор больш шырокаму выяўленьню паэтычных здольнасьцяў.

Прыглядаючы вершы — мусім агулам канстатаваць пэўны поступ у А. Бартуля і, асабліва, у М. Васілька. Вершы Бартуля патрабуюць большай апрацоўкі. У М. Васілька ясна заўважаецца прыемны пераход ад сумных сялянскіх матываў да бадзёрых, жыцьцярадасных песьняў барацьбы. Асабліва ў гэтым адносінах выдзяляецца верш „Сьмялей". Вершы іншых пачынаючых паэтаў не даюць задаваляючага матарыялу для большых увагі. Пачаткі. Вершы Вялецкага патрабавалі-б добрага „ножыка", асабліва з боку мовы. Але сьвежасьці думкі адкінуць ня можна.

Што яшчэ трэба заўважыць у адносінах да ўсіх паэтаў, вершы якіх зьмешчаны, гэта—кансэрвацыя думкі ў рамках старых, ужо даўно перажытых катэгорыяў. Адраджэньне, краіна, народ перапяныя ўсюды матывы вясны, імкненьне вызваліцца ад пут—усё нашаніўскае ўжо, цяпер школьнае, „клясычнае". Тое-ж і ў форме. У А. Бартуля і М. Васілька—пэўны поступ і тут. Але трэба—працы і думкі, асабліва А. Бартулю, ад якога пара ўжо патрэбаваць уважнейшага адношаньня да сваіх твораў, а ня пісаньня „па інэрцыі". якая далёка бязумоўна не атожсамляецца з беспасярэднім натхненьнем.

Натхненьне, пачуцьцё і талент — рэчы „нятыкальныя", але паэта мусіць быць, як на „назе з векам", гэтак і пэўным спэцыялістым у сваей галіне. Гэтага—мала адчуваецца ў нашых паэтаў. Жадаем гэтаю кароткаю ўвагаю памагчы ім.

„Думка" часопісі—мусіць быць у ідэолёгічных артыкулах. На жаль—іх амаль зусім няма. Скажам проста — дзяцінае ляпатаньне Ст. Ст. у рамках тых самых нашаніўскіх катэгорыяў. Вельмі слаба рэпрэзэнтуе віленскае студэнства іх калега. Дадамо хіба „Балючую справу" Г. Вял. аб спорце, дзе ў аснове—усё тыя-ж самыя катэгорыі.

Вельмі сымптаматычны ў зьвязку з гэтым зьяўляецца артыкул Ст. Грынкевіча „Узгадаваньне характару". Пытаньне чыста абстракцыйнае, выходзячае аднак з асноваў узбуджанага маладога беларускага нацыяналізму. Вельмі цікава, куды кіруецца думка нацыяналістычнай моладзі. Гэта бязумоўна падсьвядомы, але ў высокай ступені шкадлівы адыход маладое інтэлігенцыі ад жыцьця працоўных масаў і жаданьне замкнуцца ў невялічкім інтэлігенскім „чучарапку". Хаця-ж тут галоўнаю артэрыяй зьяўляецца агульнае імкненьне моладзі „паходзіць на дарослых", разглядаць пытаньне „паважна"— але перуч з г тым зау жаецца і ўсо м неня адыход. Суцэльная думка—арганізм і нацыяналізм таксама суцэльны і яўна не заўважаецца жыцьця аграмаднае большасьці свае нацыі, пакіроўваючыся ў бок ад гэтае большасьці.

Вось і ўсё. Апрацаваная легенда „Над Нёмнам"—проба вельмі слабога пяра Ст. Ст. Ня варта задзержвацца.

Як агульныя рысы ўсяе часопісі заўважым—думаньне старымі катэгорыямі, дастанымі са школьнай лаўкі, брак узьлёту і навізны думкі, брак наагул арыгінальнае думкі, брак дыскусіі на тэмы сучаснага жыцьця і на тэмы ідэалёгіі, поўная адсутнасьць зацікаўленьня жыцьцём працоўных грамадаў, павадырамі якіх маладыя „інтэлігенты" напэўна думаюць быць, да таго-ж яшчэ ясна відзен і поўсьвядомы адыход ад гэтых грамадаў, якія па часопісі зьяўляюцца, як ні дзіўна—толькі этнографічнай масай, ад якой можна браць толькі „творчасьць".

Запраўдная ідэалёгія ў зьвязку з гэтаю малою вартасьцю часопісі — ня відная. Як поўная рыса выяўляецца—нацыяналізм, які даходзіць аж да абсурду, (крытыка друкаваных працаў Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску аж з... 1922 году). Але на сколькі гэты нацыяналізм выяўлен чыста „па школьнаму"—можна думаць, што ён — толькі „плыцьцё па цячэньню" нашаніўскай ідэалёгіі, якая ў свой час была і сьвежай і арыгінальнай і рэвалюцыйнай. Апошнія мамэнты зусім адсутны ў часопісі.

З усяго выцякае, што запраўды такі „студэнцкае думкі"—няма. Есьць імкненьне „здавацца дарослымі", „служыць бацькаўшчыне", паказаць, што і мы штосьці можам,

з іх самастойна ня мог правесьці ані аднэй апэрацыі. Ніякіх вымаганьняў што да палітычнай арыентацыі сяброў ня было. Духоўныя асобы таксама былі сябрамі Банку і некаторыя мелі значныя ўклады, як напр. Васілеўскі. Даходы Банку былі вельмі малыя і не пазвалялі навет акуратна выплачываць пэнсію служачым, якая ў дадатку была зусім нязначная (ад 55 і да 100 зл. ў месяц). Справаздачы пасыліліся да Ізбы Скарбовай. Часта адбываліся рэвізіі. Усялякія пастановы зацьвярджаў агульны сход сяброў. Многа з іх было выключана, бо ня ўносілі грошы. Вялікіх сум ня ўплывала. Сябрамі Банку зьяўляліся б. пас. Рагуля і сэн. Назарэўскі.

Ачытваюцца паказаньні сьв. Буські Арк. і Кузьміча. Першы кажа, што да Б.С.Р. Грамады сяброў прынімалі вельмі асьцярожна, каб не дапусьціць Камуністаў. Другі ў сьледаваньні сьцьвярджае, што яго ў паліцыі білі да няпрытомнасьці, што яго паказаньні дзеля гэтага не згодны з праўдай.

Сьв. Цясельскі Улад. пал. гавора, што аб. Кузьміч закладаў гурткі, скардзіўся на вялікія падаткі, якія, па яго славах, трэба было-б перанесьці на паноў. Часта зьвяртаўся да зямельных паліцэяў з пытаньнем, „чаго вы тут едзіце, гэта-ж на ваш край“.

Сьв. Ян Ціхан ведае абв. Гоцьку Кляўдзію, як дзяўчыну з Б. С.-Р. Г. Ня чуў адняк-жа, каб яна калі агітавала за няплату падаткаў.

Сьв. Дэмбінскі Ян, пал. кажа аб жыўнасьці, якую зьбіралі пад кіраўніцтвам абв. Кузьміча для палітычных вязьняў. Пры рэвізіі ў Кузьміча знайшлі адозвы, пісаныя ім, з якіх, пасьля адчытаньня Судом, вынікае, што Кузьміч заклікаў сяброў Грамады Навагрудз. пав. памагчы арыштаваным грамадзістам Навагр. і Стаўпецкага пав.

Сьв. Фэцан Балес., асадак, сьцьвярджае, што Грамада высоўвала антыпанствовыя лёзунгі, намаўляла народ непаслухацца польскіх уладаў. Спатыкаўся з дзеяльнасьцю абв. Гоцькі Клаўдзі і Кузьміча. Аб маніфэстацыі ў Карэлічах, якая адбылася 8/XI 26 г., ведае ад аднаго сябра Грамады, які, будучы п'яным, пайшоў на гэтую маніфэстацыю. Прозьвішча яго сказаць ня можа, бо гэта быў канфідэнт.

Сьв. Гішчук Язэп, пал. кажа аб сабраньні гуртка, на якім прамаўляў абв. Кузьміч. У канцы праспявалі бел. народны гімн і разыйшліся спакойна.

Сьв. Красінскі Ст. гм. сэкр. кажа, што абв. Гоцька Клаўдзія агітавала, каб не плацілі падаткаў, калі яна ўрадоўцаў дамагалася беларускіх школ, хаця ў Карэлічах і была ўтраквістычная. Ведае аб гэтым ад свайго пам. Ціхана. Старшыня Суду адчытвае паказаньне Ціхана і сьцьвярджае, што Ціхан сьведцы нічога не казаў.

Абв. Гоцька Кл. сьцьвярджае, што ў 1926 г. ніякай школы польск.-бел., аб якой казаў сьведка, ня было і што яна дамагалася раз утраквістычнай.

Сьв. Ярат, пал. кажа аб „судах трох“, якія быццам меўся арганізаваць Цэнтр. Сэкрэтарыят Грамады. Ведамасьці аб гэтым мае ад канфідэнтаў. На пытаньне адв. Гонігвіля, ці „Суд трох“ распачаў сваю дзейнасьць, адказвае, што так, але, хто быў судажаны, ня ведае.

Сьв. Нузбэн, аф. вывяд. К. О. П. Акінчыц, Падліпская, Станкевіч Эдв., Троска Ап. нічога новага да справы ня ўносяць.

Сьв. Пашкоўскі Ануфрэй ня ведае, ці абв. Кузьміч вучыўся ў Камуністычнай школе, ці сам вучыў на камуністычнай тэрыторыі. **Сьв. Сломэ**, асадак, 6. XI. 26 г. чуў сьпеў інтэрнацыяналу каля Карэліч. На маніфэстацыі ў Карэлічах (8. XI. 26 г.), бачыў два чырвоныя сьцягі з надпісамі, якіх ня памятае.

18-ты дзень працэсу з дня 26.III.

Сьв. Яцубоўскі Яз. аспірант на абшары м. Горадні меў дачыненьне з Грамадой 3 разы: 1) быў на справаздаўчым мітынгу, які адбыўся ў Алякшыцах (каля Горадні), на якім было каля 5.000 людзей. Мітынг адбыўся пад адкрытым небам. Прамаўляў пасол Валошын, як гаворыць сьведка, вельмі востра, называючы паліцыянтаў „pachołkami Piłsudskiego“ і падбураў людзей, якія пачалі ўзбраяцца ў палкі і каменьні, пабілі паліцыянта Кутыбу і другога, прыпёршы да муру, патурбавалі. (Мітынг быў у дзень кірмашны); 2) Быў зьезд у Горадні, на якім былі Тарашкевіч, Валошын, Якімовіч і якіх 300 грамадоўцаў. Падышоў да яго (сьведкі) Якімовіч, а пасьля Тарашкевіч і сказалі, каб ён апусьціў са сваім паліцыянтам сходку. Якімовіч крытыкаваў Урад і вельмі няпрыхільна гаварыў „пад маім адрасам“. На сходцы мелі грамадоўцы сваю міліцыю, пазнаць можна іх было па нашыўках на рукавох з ініцыяламі.

Адв. Залкінд. Ці сьведка чуў калі, як Якімовіч крытыкаваў Урад? **Сьв.** На ўласныя вушы ня чуў.

3) Падчас ліквідацыі Грамады была рэвізія ў Ламашэвічанкі і Пісаранкі, у якіх у памяшчэньні знайшоў ён паквітаваньні. Гэтая Ламашэвічанка атрымоўвала ад Валошына грошы (ўсяго каля 2.000 зл.), за якія купляла жыўнасьць для палітычных вязьняў у горадзенскім вастрозе. Было іх ад 190-215 ч.

Сьв. Ольчук, канфідэнт, гаворыць аб 2-х сходках, якія адбыліся ў 1926 г. пры Мастовай вул. 2, на якіх былі пераважна сяляне, некалькі жыдоў, кабет і работнікаў. Зазначае, што на гэтай сходцы быў толькі адзін карэспандэнт з часоп. „Moment“.

Якімовіч заяўляе, што, апрача гэтага карэспандэнта, былі яшчэ і другія і вымяньвае іх прозьвішчы. Затым сьведка нічога новага ня ўносіць.

Сьв. Кухарскі Ант., паліцыянт, хацеў разагнаць маніфэстацыю, якая адбылася 7.XI—26 г. у Сьвентаволі. Паход гэты складаўся пераважна з грамадоўцаў. Нясьлі чырвоны сьцяг, на якім, па словах сьведкі, быў нарысаваны серп і малаток і напісана: „няхай жыве камуністычная партыя“. Удзел бралі пераважна мясцовыя; памятае сьведка толькі Ушылу Ф., Чуйку, Корасевіча, Гарбовіча Сым. Калі ён (сьв.) хацеў разагнаць маніфэстантаў, Ушыла крыкнуў на яго: „забіць яго, гада“!

Адв. Сьмяроўскі: Ці 7.XI.—якоесь сьвята камуністычнай моладзі? — сьведка ня можа даць на гэта адказу.

Сьв. Лінкевіч Е., канфідэнт з Саколкі, гаворыць, што ведае Якімовіча ўжо з 6 гадоў. Сьпярша быў Якім. эсэрам, пасьля перакінуўся да Ластоўскага, у 1924 г. працаваў у кампартыі і ў 1924 г. быў арыштаваны за прыналежнасьць да КПЗБ, якая была зьліквідавана ў 1925 г.

Адв. Сьмяроўскі: скуль сьведка ведае, што Якімовіч належаў да КПЗБ?—Часткава ад канфідэнтаў і ўласных абсэрвацый.

Далей гаворыць сьведка, што Расіньскі і Руды карэспандавалі з Бурсэвічам у справе Грамады, і што жонка Рудога прыяжджала ў Вільню ў Цэнтр. Сэкр. Бурсэвіч асьвядчае, што прозьвішча Расіньскі і Руды яму ня ведамы. Некаторыя інфармацыі апірае сьведка на Гурыне, з якім ён быццам бачыўся ў Горадні перад яго забойствам. Гаворыць яшчэ, што Якімовіч быў карэспандэнтам часопісі: „Большевик“ і „Чырвоны Сьцяг“.

Сьв. Ліханевіч, канфідэнт, гаворыць аб мітынгу, які адбыўся ў Алякшыцах, скліканым праз Валошына ў лютым 1926 г. Гэта быў сьвяточны дзень і людзей сабралася многа (каля 5.000 чал.). Валошын быццам ня меў дазволу ад старостава на гэты мітынг, але ўзьлез на калёсы і зачаў крычаць, каб каля яго грамадзіліся людзі. Крычаў, каб людзі не баяліся паліцыянтаў, называючы іх пахолкамі Пілсудскага. Сьв. меў тады толькі 8 паліцыянтаў, але не хацеў гэтага мітынгу разганяць „бо было многа кабет і дзяцей, дзеля чаго не хацеў праліваць нявінную кроў“. Гаворыць далей сьв. аб Якімовічу, які належыў да сэцэсыі КПЗБ і браў актыўны ўдзел падчас выбараў у Горадні да касы хворых і аб антыдзяржаўнай адозьве (ў 1926 г.)

Прав. Калапскі: хто быў рэдактарам адозвы? Сьв.—Лунеўскі, сябра акружн. камітэту.

Адв. Гонігвіль: ці сьведка выключае, што адзін з трох: Пачабут, Кулакоўскі, Баліцкі мог напісаць адозву?

Сьв.:—адозва была напісана Лунеўскім; напісана была фахова і праўніча.

Адв. Гонігвіль: ці сьв. ведае, якую маюць гэтыя тры асобы адукацыю і чым займаюцца? Сьв.—ня ведаю (?!).

Адв. Гонігвіль просіць суд запратакаліць многа супярэчнасьцяў паміж паказаньнямі сьведкі ў сьл. судзьдзі а цяперашнімі: 1) у судзьдзі сьледчага сьв. не ўспамінаў аб Лунеўскім, 2) аб сэцэсыі Якімовіча гаварыў сьв. у судзьдзі сьл., што была ў канцы 26 ці ў пачатку 1927 г., а цяпер гаворыць, што ў лютым 1926 г., 3) што сьведка не памятае, у якім часе атрымоўваў ад канфідэнтаў ведамасьці, 4) у судз. сьл. зазнаў, што Якімовіч ня быў скампрамітаваны палітычна 1 г. д.

Сьведка гаворыць далей аб артыкуле, напісаным у „Чырвоным Сьцягу“, дзе гаварылася аб разьвіцьці Грамады і „piętnowanie“ гэтай арганізацыі за тое, што прыймаюць несьвядомых людзей.

Адв. Петрусэвіч: ці гэта была крытыка Грамады, ці інструкцыя, якой гэта арганізацыя павінна трымацца — сьведка не знаходзіць адказу.

Сьведку задае **Шушкевіч** (абвін.) некалькі запытаньняў у беларускай мове, на што сьведка адказаў, што пабеларуску не разумее.

Адв. Гонігвіль: сьведка не разумее пабеларуску?

Старш. суда Аўсянка:—гэта не адносіцца да справы.

Адв. Гонігвіль. Адносіцца: Бо калі сьведка не разумее пабеларуску, то як ён мог чытаць „Чырвоны Сьцяг“?

Адв. Гонігвіль. Якой сьв. адукацыі?

Старшыня ўхіляе пытаньне.

Адв. Сьмяроўскі на падставе 702 арт. просіць суд гэтае пытаньне ня ўхіляць, дзеля таго што перад гэтым дазволіў такое самае пытаньне паставіць Навакоўскаму, а з другога боку абарона хоча мець пэрспэктыву на прышласьць, што гэтае пытаньне, як пытаньне легальнае, будуць магчы задаваць прышлым сьведкам, і што ў суд ня будзе ставіць труднасьцяў.

Старшыня суду на падс. 611 арт. ухіліў ізноў гэтае пытаньне.

Валошын выясьняе, што паказаньні сьв. Ліханевіча непраўдзівыя, дзеля таго, што на мітынг у Алякшыцах ён меў дазвол за 8 дзён ад старостава. У апошнім дню прышла са старостава другая паперка, дзе ізноў не дазвалялася на мітынг. Ён (Вал.) хацеў толькі людзям прачытаць гэтыя дзьве паперкі, але гэты самы Ліханевіч з паліцыянтамі яму не дазволіў і сам некуды ўцёк. Валошын прачытаў людзём толькі гэтыя паперкі, затым нічога ня было.

Сьв. Ламашэвічанка Надзея складае свае паказаньні ў беларускай чыстай і пекнай мове; належала да Грамады. Атрымоўвала ад Валошына грошы на жыўнасьць для палітычных вязьняў у Горадні.

Адв. Этінгэр: ці пані рабіла гэта патаемна?

Сьв. Не! Мела дазвол ад пракуратуры і ніколі не прыпушчала, што даваньне жыўнасьці вязьням ёсьць праступствам! Займалася яна гэтым якіх 3 месяцы. Валошын гаварыў ёй памагаць усім палітычным вязьням. На каждага выпадала ў нядзелю якіх 2-3 зл., а часамі і нічога. Вязьняў было якіх 100. Сьпіс (лічбу) вязьняў даваў ёй заўсёды інспэктар вастрогу і радзіў ёй купляць правізію ў турэмным склепе

Сьв. Мукасей Сьц. быў старшын. гуртка і зьбіраў на паліт. вязьняў ахвяры. Быў ён на зьезьдзе ў Горадні, дзе меў прамову Тарашкевіч, але аб злучэньні Зах. Бел. з Усходняй не гаварыў, крытыкаваў толькі некаторыя партыі.

Прав. Калапскі: ці пісалі Вы пісьмо ў Расею, што ў Польшчы дрэнна?

Сьв.—так, пісаў!

Адв. Гонігвіль. Хто вам казаў зьбіраць грошы на паліт. вязьняў?—Сьв. Зьбіраў я сам, бо вычытаў у белар. газэце, што там былі паквітаваньні з атрыманых грошаў. Сабраў 6 зл. і адаслаў у павят. камітэт.

Сьв. Ольчык, канфідэнт, нічога новага ў справу ня ўносіць.

Сьв. Сарыпэк Фр., паліцыянт, гаворыць аб падсудным Драгуну, у якога пры вобыску была знойдзена стрэльба пістонаўка, 490 патронаў пад печкай. На другі дзень Драгун зьявіўся на пастарунак, дзе яго арыштавалі. Апрача гэтага, была знойдзена пры вобыску кніжка пратаколаў, якую паказваюць падсуднаму. Драгун гаворыць, што гэта тая самая кніжка. Знойдзена была яшчэ паперка, на якой было напісана: „сяляне і работнікі ўсіх краёў злучайцеся! Няхай жыве сялянска-работніцкі ўрад“—да яе Драгун не прызнаецца. Падсудны выясьняе, што патроны гэтыя засталіся пасьля бальшавіцкага наступу, з якіх ён даставаў порах і страляў са стрэльбы.

Сьв. Пісаранка Зоф. пазнаёмілася з Валошыным у Горадні, які запрапанаваў ёй, каб яна насіла паліт. вязьням (усім) жыўнасьць. Пасьля яе заступіла Ламашэвічанка. Інспэктар вастрогу Ласкі парадзіў ёй, каб яна купляла правіант лепей у вастрожным склепе, чымся ў жыдоўскім. У тыдзень на вязьня выпадала якіх 2.50 зл. На ўсіх вязьняў у тыдзень выпадала ад 200 да 220 зл.

Сьв. Сляўка Марыя, канфідэнтка не зьявілася, а прыслала свае паказаньне ў пісьме, якое суд адчытаў. Гаворыць аб Станкевічу Уладз., які меўся быць лучнікам паміж Саветамі і КПЗБ, і прывозіў з Сав. камуністычную літэратуру.

Сьв. Шока Густ. канфідэнт і **Пятровіч Міхал** нічога ў справу ня ўносяць.

Сьв. Валь Альфонс, канфідэнт, у студзені 1927 г. у Акр. Упр. Т-ва Бел. Школы ў Горадні пры вул. Гарохавай у 23 гадз. рабіў рэвізію, дзе застаў 6 асоб: Баліцкага, Паддубіка, Ламашэвічанку і другіх. Пры рэвізіі ніякіх кампрамітуючых матэрыялаў ня было знойдзена.

Паказаньні іншых сьведак няцікавыя, дзеля чаго іх і не падаём.

19-ты дзень працэсу з дня 28./III.

Сьв. Грын Тод. гаворыць аб сходцы, якая адбылася ў вёсцы Таполе. Слаба ён арыентуецца ў справе і нічога канкрэтнага сказаць ня можа.

Сьв. Кішкель Ал. на суд ня ставіўся, бо сядзіць у вастрозе з арт. 102, дзеля чаго прыслаў свае паказаньне ў пісьме. Належаў ён да КПЗБ, але ў Грамаду ня ўступіў. Марцінчыка ня ведае і навет не карэспандаваў з ім.

Сьв. Дамброўскі, камэнд. паліцыі ў Горадні. У горадзенскім вокрузе было каля 10.000 асоб, якія належалі да Грамады, і былі, па яго словах, адначасна сябрамі КПЗБ, або яе сымпатыкамі. У Скідлю адбыўся ў 1926 г. мітынг, на якім прамаўлялі — „умяркована“ Тарашкевіч і „востра“ Валошын, які быццам закончыў сваю прамову славамі: „...У народзе сіла, у руках Ваш быт! Калі не даюць—бярэце самі“! Далей гаворыць сьведка аб Якімовічу, Паддубіку, Баліцкім і што Паддубік атрымоўваў кам. літэратуру.

Адв. Гонігвіль: сьведка сказаў, што Паддубік кальпартаваў літэратуру, калі гэта было?

Сьв. Добра ня памятаю.

Адв. Гонігвіль. Колькі было людзей, якія належылі адначасна да КПЗБ і Грамады?

Сьв. Добра ня памятаю, засуджаных здаецца 3—4.

Падсуд. Шушкевіч: „сьведка сказаў, што я быццам сьведку гаварыў, што атрымоўваў 200 зл. і што сьведка мяне дапрашваў. Асьвядчаю, што гэтага чалавека я бачу ўсяго першы раз і што, будучы старшынёй, атрымоўваў толькі 90 зл“.

Сьв. Костшэба Сьцяп. (паліцыянт) і **Мацеўскі Мар.** (канфідэнт) ня ўносяць у справу нічога новага.

Сьв. Нэстэровіч Чэслаў, канфідэнт, гаворыць аб аружжы, якое мелася паходзіць ад Шушкевіча і прыходзіла да Сіцькі, Лукасэвіча, Лукасіка і Міськевіча, якія быццам яму

але можна сьмела сказаць, што навет саміх віленскіх беларускіх студэнтаў „С. Д.“ не задаваляе. Чытаецца для цікавасьці, як кожны новы друк, але па сабе ніякага сьледу не пакідае. Жутла. Роблена абыяк. Не пастаўлена, ня то, што вырашана, жаднай праблемы, усё чыста жыцьцё чуць не дзесяці гадоў прапушчана міма. Пакінем ужо ідэалёгію—няма наагул асьвятленьня жыцьця, якое павінна ў студэнтаў, як гаворыцца, біць крыніцай, выяўляючы яго і ідэалёгію ну хоцьбы ўсіх кірункаў, якія ёсьць у віленскім студэнстве, пэўнае змаганьне іх між сабой, выяўляючы наагул думку, якая выкоўваецца ў барацьбе. Можна падумаць, прачытаўшы „С. Д.“, што няма ў Вільні думаючых беларускіх студэнтаў. Гаворачы мягка—„С. Д.“, якая вышла пасьля доўгае пярэрвы—бязумоўна кампрамітацыя віленскага беларускага студэнства.

Студэнства! З гэтым імем зьвязана запраўднае кіпучае жыцьцё, імкненьне наперад, шуканьне новых шляхоў для духу, адбіцьцё усей паўнаты народнага, працоўнага жыцьця... Узяць „Гоман“, першыя праявы масавага беларускага адраджэньня, сацыялістычную грамаду, „Нашу Долю“ — усё, што ёсьць яскравага, запраўды паступовага ў нашай маладой гісторыі — ці ня зьвязана ўсё гэта са студэнствам?

„Агульна-беларуская ідэя“, непатрэба „сварак“ (так завецца дыскусія ў студэнтаў), вяласьць, навет рэгрэс у думцы—вось адзнакі цяперашняга віленскага беларускага студэнства. Ня кажам ужо аб іншых рэчах. І гэта—„цьвет народу“?

Бязумоўна, што гэта яе да ўсіх адносіцца Есьць малады пыл і тут і фактам доказу зьяўляецца самая „Студэнская Думка“. Але яна—такое дзіця, якое нібы яшчэ ўчора пачало хадзіць і спатыкаецца, і баіцца, і... „мама не вяліць“. Бязумоўна, падстава ўсяму—абставіны, але і пры гэтых абставінах „ня ўсё у парадку“.

Што трэба? Думаць, чытаць, дыскутаваць, прыглядацца да жыцьця, быць чыннікамі гэтага жыцьця, пашыраць эрудыцыю, выпрацаваць сабе ідэалёгію, а галоўнае—ісьці ў ногу з працоўнымі грамадамі! Інакш і „гісторыя закляйміць“ вашае жыцьцё! **Amicus.**

Малады Молат.

ЗНАЙШОЎ.

Восень! Ноч цемная. Вецер свішча па-за хатамі. Вось паляцеў ён на адзінокі сокар, сарваў пару апошніх лісткоў, завіўся, і кінуў іх у гразь вуліцы; потым трохі заціх на хвілю, каб пасьля з новай сілай наляцець на саломеныя стрэхі і пырснуць дробным даждждом у маленькія, на—поў заложаныя шматамі і лучынкамі шыбкі ваконец нявялікіх хатак вёскі і, нічога не зрабіўшы, завыў са злосьці ў коміне і пасьля памчаўся ў поле шукаць сабе прыстанішча.

У вадной з такіх хат, ня гледзячы на позную гадзіну, відаць быў сьвет. Падышоўшы бліжэй, можна была разглядзець седзячых ля стала двух мужчын, адзін з іх быў Міхась, хлапец малады, гад. 18, з вельмі задуманым тварам; другі, як відаць, быў бацька, гадоў 60. Яны між сабою аб нечым гутарылі і, як відаць было па іх руках, вельмі сярачаліся.

Вось Міхалка ўскочыў, як падпалены і чуваць было, як ён крыкнуў: „Досіць, тату, я больш ня вытрымаю!.. як сабе хочаце, я пайду!“ Бацька зьбялеў і хапіўся за кія, які ляжаў на лаве, але Міхалка ўжо быў за дзьвярамі. „Чакай, сабачы сын, чакай“ — крычаў разгарачыўшыся бацька. „Вось, як забяруць у турму, тады будзеш ведаць, як бацькі слухаць! Не з тваім носам арыштоўваюць! Бачыш ты яго, змагар знашоўся! Смаркаты яшчэ! „Коні куюць, а жабы лапы падстаўляюць“!

Глядзі, я табе пакажу! Каб тваей нагі тут ня было!“ — І ён, трэснуўшы дзьвярмі, увайшоў у хату. А Міхалка ўжо быў у канцы вёскі, ён ішоў і ішоў у кірунку места. Ён быў вельмі знэрвованы. „Што мне рабіць, што мне рабіць?—думаў ён.—Бацька спакою не дае, аб астальных і казаць няма што, усе пілуюць і ядуць жыўцом. А можа бацька праўду кажа? І нашто я ўлез“... І ён абарваў, сам спалохаўшыся таго, што падумаў,—тупнуў нагою—„Не, ніколі шкадаваць ня буду, буду цярпець, няхай сабе называе тата мяне „фанатыкам“ ці дурною башкою, я ні на крок ня зыйду са сваей дарогі“. І ён пайшоў бадрэй, не зважаючы на разбрухітанае балота і на дождж, які ліў, як з вядра, і толькі быў час-ад часу перарываны налятаўшым ветрам. Ён не агледзеўся, як прайшоў 10 кілямэт. і ўжо ўвайшоў у прадмесьце. Яшчэ заставалася парайсьці некалькі вуліц. Ён глядзеў на прадмейскія хаты, у якіх мясьцілася пралетарская беднота; ён і сам быў пралетар і жыў толькі ў вёсцы на незалежных абставінах: яго бацька быў чыноўнік, а пасьля яго звольнілі, бо ён быў „ненадзёжны“, а Міхалка мусіў хадзіць на заработкі, і тады ён наглядзеўся, як мучыцца працоўны народ, як зьдзеківаюцца абшарнікі, ды фабрыканты, як высысківаюць абдзертых, ды галодных пралетараў, тады ўжо Міхалка кляўся адамсьціць ім, і працаваць на дабро працоўных!...

Але ўсе ён ня мог выбіцца на дарогу, якая вядзе да Сонца Працоўных, і вось калі ён сяньня ідзе па гэтай дарозе вельмі цярністай, яму яшчэ ногі падстаўляюць яго бацькі: „Ну выбачайце, тату! Вы мыліцёся, я хоць і згіну, то буду ведаць, за што, бо нашай моладзі толькі адзіны выхад, гэта змаганьне поруч з працоўнымі, і толькі тады перамога наша!“—І ён увайшоў у панадворак знаёмай яму хаты, у якой сьвяцілася яшчэ ў вокнах, застукаў у дзьверы і ўвайшоў у хату. Пасьля бурных прывітаньняў са староны яго калегаў, якія яго ўжо тут чакалі, ён стаў слухаць прарванае чытаньне газэт.

Ужо была позна, калі Міхалка быў на той жа дарозе, адкуль прышоў; дождж ужо перастаў, але вецер не даваў проста дыхаць! Міхалка шагаў усе ўперад і ўперад, вочы яго гарэлі агнем, твар прамянела перакананьнем, а вусны шапталі: „Уперад! Уперад! Змагацца да астатняга дыху, і высілку, высока падняць сьцяг працоўных. Уперад!

аб гэтым гаварылі. Зазналі яны яму аб гэтым аружжы, але... не знайшоў ён (сьведка) гэтых карабінаў.

Адв. Гонігвіль сьцьвярджае супярэчнасьць паміж паказаньнямі ў судзьдзі сьледчага і цяперашнімі, бо ўпярод гаварыў аб 9—12 карабінаў і 6 рэвальвэрах, а цяпер 6 караб. і 12 рэвальв.

Адв. Гонігвіль. Сіцько сказаў сьведку аб карабінах і рэвальвэрах, што іх мае, а дзе ў яго схаваны яны—ці сказаў?

Сьв. Не сказаў. Аружжа меўся прывозіць крывы жыд Левін.

Сьв. Жэвускі (паліцыянт) гаворыць аб мітынгу, на якім меў прамову Валошын. Гаварыў ён быццам, што бюджэт у Польшчы вельмі вялікі, бо ўтрымліваецца многа войска і паліцыянтаў, якія „толькі цягаюцца па вёсках, стукаюць шаблямі па вуглах і тынках, чакаючы, каб выскачылі сабакі, за якіх пасьля маглі-б пісаць пратаколы".

Сьв. Сташыньскі Яз., функц. паліцыі палітычнай у Горадні, гаворыць, што Валошын у сваей прамове быццам намаўляў людзей на адным з мітынгаў не плаціць падаткаў, бо „за гэтыя грошы купляюць кайданы для нашых сялян". Характэрызуючы дзейнасьць Грамады і галоўных правадыроў яе, зазначыў, што ён мае даныя з апошніх вывядаў, што напад на Гурына, які быў у Горадне ў 1926 годзе быў прыгатаваны быццам Шушкевічам і Паддубікам, апошні ніба часткова яго выканаў. Пры апошніх словах сьведкі падсуд. Паддубік голасна з месца крыкнуў: „ён ілжэць! ізноў паліцэйская правакацыя"! Старшыня Суду прыказвае яго вывесьці.

Адв. Сьмяроўскі. Сьведкі не павінны даваць зазнаньняў з цяперашніх, з апошніх, часоў, дзеля таго, што гэта ёсьць рэчы зусім новыя, якія будуць запратакалаваны і будуць абцяжаць ня толькі палажэньне Шушкевіча і Паддубіка, але наагул усю справу. Дзеля таго, што мы ня можам даць контрдовадаў, бо сьведка апіраецца на канфідэнтах, якіх не падае прозьвішчаў, прашу суд выэлімінаваць гэтыя зазнаньні, бо сытуацыя зьмяшчае супярэчнасьць, якая ня можа быць дапушчанай. Пасьля выступаюць процiў таго, каб сьведка гаварыў у гэтай справе, адв. Гонігвіль і Петрусэвіч. Судзьдзі некалькі мінут нараджаюцца, па чым не дазваляюць сьведку гаварыць у гэтай справе. Далей гаворыць сьведка, што актыўны ўдзел бралі грамадоўцы пры выбарах у Касу Хворых, Раду Мейскую ў Горадні.

Сьв. Станевіч Валер., вельмі тупая адзінка, нападае на Паддубіка. Гаворыць, што ён шчыры „patrjota polak", але з яго мовы адносіцца ўражаньне, што многа яму трэба яшчэ напрацаваць над сабой, каб навучыцца хоць прыблізна гутарыць папольску.

Сьв. Жмойлік Каст. быў скарбнікам пав. кам. у Горадні 2 месяцы, за якія да яго ўплыло многа грошы, „бо сябры ўносілі акуратна складкі". „Выдаткі былі на 1) беларускі сьцяг, 2) купляньне кніжак і г. д., так што грошы хапала і навет частку адсылаў да Цэнтралі". Пэнсіі за сваю працу не атрымоўваў, а служыў ганарова.

Палітычная хроніка.

Новы Сойм.

Стары, аджыўшы польскі Сойм, апрача кепскага, нічога добрага ня даў нам Беларусам. Замест зямлі—беларускае сялянства дастала добрых падсуседзяў асаднікаў; замест крэдыту на адбудову зруйнаванай вайной гаспадаркі, Сойм адабраў у беднага селяніна астатнюю яго горкую пацеху—ататняе каліва тытуню. І беларускія працоўныя гушчы, як марнаваліся і захлыпваліся ў нэндзы і жабрацтве, так і цяпер у іх па самыя вушы.

Беларускаму адраджэнскаму руху стары Сойм таксама нічога добрага ня даў, адно толькі кепскае. Ад старага Сойму беларускі адраджэнскі рух атрымаў добрыя падарункі: знамянітыя языковыя законы, дзякуючы якім ня можа мець ні адной беларускай ня толькі ўрадавай, але і прыватнай школы і закон аб антыдзяржаўнасьці, дзякуючы якім, кожнага сьвядомага беларуса—залічаюць да камуністых. Дзякуючы гэтым законам аб антыдзяржаўнасьці, кожная нацыянальная думка залічаецца да антыпаньствовасьці; справядлівая ў рамках польскай канстытуцыі думка аб незалежнасьці, залічаецца да здрады стану, да „oderwania się od państwa", і турмы перапаўняюцца лепшымі беларускімі культурнымі сіламі, лепшай перадавой сьвядомай часткай беларускага народу.

Чаму-ж гэта стары Сойм аднёсься так варожа да беларусаў, і да іх нацыянальнага адраджэнскага руху? Мусіць, у гэтым Сойме ня было прадстаўнікоў Беларускага Народу, якія-бы баранілі яго інтарэсы? Мусіць, у гэтым Сойме наагул ня было прадстаўнікоў працоўных гушчаў, якія маглі-бы абараніць іх інтарэсы? Вось, гэтае пытаньне цяпер і разгледзім.

Большую частку папярэдняга Сойму складвала правыя польскія нацыяналістычныя партыі: эндэкі, хадэкі, пястоўцы і эніпэроўцы, якія разам мелі каля 230 пасло̆ў. А апрача беларускіх паслоў, досыць лічнымі былі і польскія лявіцовыя партыі, як „Вызваленьне і ППС". Яны разам мелі каля 90 паслоў. І вось дзіва, гэтыя „прадстаўнікі польскіх сялян і работнікаў" заўсёды галасавалі згодна з буржуазіяй — проці працоўных масаў ня толькі ня польскіх, але і польскіх. Так. Гэта Тугутт, (Вызваленьне) падпісаў законы аб „антыдзяржаўнасьці". Гэтага галасамі гэтай „польскай лявіцы" буржуазія ўхваліла ў Сойма 25 га сакавіка 1925 г., падаткі ад хатняй жывёлы 12 мільён. у год; гэтымі-ж галасамі была адкінута буржуазіяй прапазіцыя радыкальных сялянскіх партыяў аб непавялічваньні цэнаў на сярнікі, тытунь, соль і газу. Пры помачы гэтых-жа галасоў, буржуазія адкінула ў канцы лістапада 1925 года прапазіцыю 50 мільёнаў пазычкі дробным сялянам, а дні за тры потым ухваліла 65 мільёнаў пазычкі для банкіраў. Гэтыя-ж польскія „лявіцовыя" партыі галасавалі ў 1925 годзе ў Сойме проці прапазіцыі радыкальных клюбаў аб тым, каб кара за спазьненьне ў выплаце падаткаў накладалася толькі на заможныя клясы (фабрыкантаў, абшарнікаў і ім падобных), а не на бедных сялян.

Цяпер-жа правыя польскія нацыяналістычныя партыі праваліліся на карысьць 1 і лявіцовых партыяў, залічаючы да іх ППС і Вызваленьне. Дзякуючы правалу правіцы і цэнтру, значную большасьць у Сойме, мае „Лявіца", якая і выбрала свайго марш. Сойму Дашынскага (ППС). Гэты выбар адразу падзяліў Сойм на дзьве галоўныя групы: Бэзпартыйны Блёк супрацоўніцтва з Урадам (меншая) і „Лявіца" (большая). Антаганізм паміж гэтымі групамі расьце; так Блёк супрацоўніцтва з Урадам адмовіўся мець месца ў соймавым прэзыдыуме, ня хочучы браць на сябе адказнасьці за соймавую працу.

Лявіца ж ніба шмат парадыкалела, нібы шмат наразумелася, чым лявіца старога Сойму. Напрыклад зблёкаваная выбарная акцыя ў заходніх „крэсах" ППС і Вызваленьня. Але, ня гледзячы на гэта, згодніцкія з буржуазіяй тэндэнцыі гэтай польскай лявіцы ўжо выступілі ў асобе яе марш. Сойму—Дашынскага, прамова якога імкнецца да супрацоўніцтва з абшарнікамі і капіталістамі. А пачакаўшы далей, пэўна выявіцца й болей, прошласьць гэтых партыяў паказвае, што яны многа шумяць, ня дзеля таго, што яны шчыра хочуць змагацца за інтарэсы выбраўшых іх працоўных гушчаў, а дзеля таго, гэты вялікі шум, каб ведалі, што іх многа і што яны ўмеюць шумець, дык дзеля таго, каб яны ня шумелі, трэба, каб ім кінулі добрую костку, або дужа костачак, тагды ўжо кожны з іх будзе смактаць гэтую костачку і ні на што не зьвяртаць увагі.

І хоць многа лепш было-бы памыліцца на гэты раз у гэтых згодніцкіх „лявіцах", але ня маем права цешыць сябе пустымі надзеямі, ня маем права спадзявацца на гэтыя так моцна скампраметаваныя згодай з буржуаз. рукі. Маем права спадзявацца толькі на свае ўласныя мазольныя рукі ды на сваіх уласных сялянска-работніцкіх паслоў.

У Польшчы.

Новыя мэтоды.

Пад такім загалоўкам „Gazeta Warszawska" зьмяшчае наступнае:

„Выбарная" кампанія цяпер багата на рознародныя мэтоды, што ў нашым перадвыбарным жыцьці да гэтага часу ніколі не практыкаваліся. Перш-найперш прыцягвалі спачувальнікаў надзеямі на мандат, ахвяроўвалі некалькім ці некалькінаццацём кандыдатам першыя месцы, абы толькі ўвясьці разброд у іншыя палітычныя партыі. Палявалі так перш за ўсё на тых, што мелі кандыдаваць з іншых групаў.

Калі-ж цяпер ня можна ўжо карыстацца гэтай мэтодай, бо сьпіскі кандыдатаў паданы, і клямка запала, прытасоўваюцца іншыя спосабы. Каб здыскрэдытаваць праціўніка, зьвяртаюцца да кандыдатаў, што стаяць на лістах і сапраўднымі спосабамі намаўляюць іх зрачыся кандыдатуры.

Так сталася напрыклад у Лодзкім вокруге з Вызваленьнем, гдзе — як піша санацыйная прэса — мела некалькі сяброў гэтай партыі перайсьці да адзінкі. З гэтай прычыны ўрад Вызваленьня зьмясьціў у іншай мясцовай газэце платнае агалошаньне, сьцьвярджаючае, што ўсё ў парадку, што сапраўды выступіла некалькі асоб, але факт гэты ня мае значэньня. Агалошаньне Вызваленьня канчаецца такім зваротам:

— „За гэтым цікавы факт, што той-жа Ягадзінскі, бедны каваль са Злочава, некалькі дзён таму апавядаў перад сьведкамі, што за выступ з Вызваленьня і за агітацыйную бяздзейнасьць у часе выбараў ахвяруюць яму з пэўнага боку 1.000, а пасьля і 2.000 зл.".

„Gazeta Warszawska" ня кажа, хто гэта „робяць", „ахвяруюць" і г. д., мусіць, і яна баіцца канфіскатаў. Але для нас гэтыя „новыя мэтоды" ўжо старыя, мы яшчэ горшыя рэчы бачым ды маўчым.

Цікавыя дакуманты.

Газэта „Robotnik" у № 43 з 12 лютага агаласіла некалькі цікавых дакумантаў. Вось адзін з іх.

„Староства Надвурнэ, дня 28.I 1928 г. L. 71.

Да Пана Школьнага Інспэктара ў Надвурнай.

Дзякуючы рэскрыпту Пана Ваяводы 719(I)28 6.III, прашу аб выданьні адпаведных загадаў кіраўнікам і вучыцялям усіх школ у павеце, з увагай, што як рэпрэзэнтант Ураду, жадаю ад іх, як дзяржаўных урадоўцаў, поўнага прытрымоўваньня асноўной лініі палітыкі Ураду, які рэпрэзэнтую ў павеце, як таксама чыннай і яўнай працы, што імкнецца ў інтарэсе сілы і моцы Рэспублікі і ў сучасным асабліва важным выбарным пэрыядзе буду пільна сачыць за высілкамі паасобных іх працы. Стараста: Сенірскі".

У другім пісьме з 3.II 1928 г. дамагаецца той-жа стараста ад інспэктара, каб зажадаў ад усіх сваіх вучыцялёў „bezwarunkowego należenia do lokalnych, miejscowych komitetów Bezpartyjnego Bloku Współpracy z Rządem"...

І для нас тады стане зразумелым, чаму „Kurjer Wileński" кожны дзень крычыць з радасьцяй: „Вучыцялі такога і такога павету за Бэ-Бэ"... Зьезд войтаў такога-то павету за Бэ-Бэ... і г. д. Мусіць па аналёгіі?

Заграніцай.

Завастрэньне канфлікту між СССР і Францыяй

Нядаўна неяк наладжаныя адносіны паміж СССР і Францыяй ізноў рэзка папсаваліся. Бліжэйшай прычынай канфлікту зьявілася акцыя французскага ўраду, які змусіў амэрыканскія ўлады наложыць арышт на значную суму золата, якое радавы ўрад перавёз у нью-іорскі банк—дзеля забясьпечаньня радавых заказаў у Амэрыцы. Фармальна выступіў з дамаганьнем арыштаваньня радавага золата Французскі Нацыянальны (дзяржаўны) Банк, які матываваў свае прэтэнзіі тым, што частка яго залатога запасу была ў часе вайны прывезена ў Пецярбург, а пасьля рэвалюцыі ня была выдана радавым урадам назад Банку. Радавы пасол двойчы дамагаўся ад французскага ўраду высьвятленьня справы, даводзячы няпраўнасьць прэтэнсіяў Французскага Банку. Але, як кажа тэл. „Усх. Аг.", французскі ўрад не даў ніякіх тлумачэньняў. У Маскве гэткае паступаньне франц. ураду прынята, як крок яўнай варожасьці. Ходзяць чуткі навет аб магчымасьці—разрыву дыплёматычных зносінаў паміж ССРР і Францыяй.

Важныя карады ў Маскве.

„Русспрэс" паведамляе, што ў Маскве 3 красавіка мае распачацца з'езд вышэйшых органаў камун. партыі. На парадку дня — найгалаўнейшыя справы радавага палітычнага і гаспадарчага жыцьця: апрывізацыі, манаполіі загранічн. гандлю, „контр-рэвалюцыйн. змоваў" у Данецкім басэйне, стан прамысловасьці і г. д. Старшынёй з'езду будзе Сталін, дакладчыкам у справе арыштаваньняў інжэнераў—Яраслаўскі.

Радавы ўрад адмовіўся ад забароны ўвозу аружжа ў Кітай.

На прапазіцыю з боку японскага ўраду аб — супольнай умове — аб забароне ўвозу аружжа ў Кітай — радавы ўрад адказаў адмовай. Ён дадаў, што Кітай — сувэрэнная дзяржава, дык справа ўвозу ў край аружжа — унутраная справа Кітаю.

Ізноў завастрэньне хатняй вайны ў Кітаі.

Ведамы Чанг-Кай-Шэк — на чале паўдзённай арміі ўзнавіў паход на Пэкін. Штаб арміі ўжо пераправіўся праз раку Ян-Тсе-Кіянг. Палажэньне Пэкіна і валадаючага ўсім паўночным Кітаем Чанг-Тсо-Ліна — вельмі небясьпечнае.

Справа ў тым, што на Пэкін адначасна з паўночнага — заходу націскае ген. Фэнг, апіраючыся на Манголію. Гэткім чынам Чанг-Тсо-Лін мае ворагаў — як з фронту так і з тылу. Але, можа, найгоршае гэта тое, што Чанг-Тсо-Лін зусім страціў давера ў сваіх магутных былых апякуноў — японцаў. Дык спадзявацца іх дапамогі яму цяжка. А без японскага аружжа ды жывой сілы армія Чанг-Тсо-Ліна можа рассыпацца пры першым-жа паражэньні. Бо-ж газэты ўсьцяж пішуць, што манчжурскага дыктатара ненавідзіць увесь край.

Як прайшлі выбары ў Японіі.

„Кур. Варш." зьмясьціў сьцяг цікаўных карэспандэнцыяў з Токіо — аб тым, як рабіліся і які парлямант стварылі апошнія выбары ў Японіі.

Ня гледзячы на звычайны тасаваны ў краі страшэнны выбарны тэрор, урадавая партыя не здабыла большасьці. Сойм падзяліўся неяк на 2 палавы — па 220 прыблізна паслоў урадавай партыі, так зван. „Сэйюкай", і — апазіцыйнай партыі—„Мінсэйто". Рэшта 20 паслоў належаць да сацыялістаў і беспартыйных. Ці будзе працаздольны такога складу парлямант, ня ведама. У кожным разе апазіцыя рыхтуецца да бою, маючы ў першых-жа днях сэсіі ўнясьці прапазіцыю аб недаверы да ўраду — з прычыны надужыцьцяў ураду ў часе выбараў. Вышцам ня мае веры ў новы парлямант і „Імпэратарская Рада", якая ўжо выказалася рашуча за—новыя выбары.

Карэспандэнт газэты адзначае цікаўную рэч. У парлямант увайшло — нячуваная ў Японіі дагэтуль рэч аж 8 сацыялістаў. Гэта так настрашыла бясьпечна пануючую дагэтуль у краі буржуазію і фэадальную арыстакратыю, што ўрад гр. Танакі зараз-жа павялічыў лічбу паліцыі ў Японіі—з 57 да 67 тысячаў, ці аж на 10.000 асобаў—ці больш, як 1000 на кожнага сацыяліста! Адначасна пачаліся досьледы і шуканьні — сьлядоў субсыдываньня выбарнай акцыі сацыялістаў — Радамі...

Паразуменьне, ці навет саюз Афганістану з Англіяй (?).

„ПАТ" даносіць з Лёндану сэнсацыйную вестку—з добра паінфармаваных крыніцаў—аб тым, што пасьля доўгіх перагавораў, апрацаваны трактат паразуменьня між Афганістанам і Англіяй. „Як чутно, ужо асьцярожней дадае „ПАТ", падпісаны зачэпна—абароны Саюз, скіраваны проці Расеі і Турцыі. Англійскія ахвіцэры маюць узяць на сябе падрыхтоўку афганскай арміі, англійскія інжэнеры—будову чыгунковых шляхоў у краі. Азбраеньне афганскай арміі мае быць узгоднена з тым, што існуе ў індыйскай арміі. У дадатку, як водзіцца, афганскі кароль мае атрымаць і значную пазыку ў Англіі.

Трэба сказаць, што дагэтуль такое мейсца ў Афганістане займаў, ці займае СССР: арганізуе і вучыць армію, будуе шляхі, дае тэхнічную падрыхтоўку прамысловасьці і срэдзтвы, дае дарадцаў у палітыцы. Але гэта ўсё якраз вельмі не падабаецца Англіі, якая страшэнна баіцца гэтага ўплыву Радаў у Афганістане, які зьяўляецца быццам „брамай" ў англійскую Індыю. Дык — калі гэтая „брама"—ў расейскіх руках, тады Англія ніколі ня можа быць спакойная за сваё панаваньне над Індыяй, якое стварае амаль што палову англійскага багацьця. Дык дзіва, што Англія гатова пайсьці на ўсялякія ахфяры, каб толькі купіць прыхільнасьць да сябе з боку афганскага ўладара. Калі праўда ўсё тое, што даносяць з Лёндану, дык гэта значыць поўны пераварот у дасюляшняй палітыцы Аммам-Уллаха. Дык пасьля гэтага яму запраўды-ж няма па што ехаць у СССР, як ён меў намер у пляне сваей падарожы. А тады—па таму, ці ён паедзе ў СССР, ці не паедзе, можна будзе судзіць,—ці праўда пішуць з Лёндану аб „саюзе з Афганістанам", ці гэтага саюзу яшчэ толькі хочацца Лёндану.

„Міністэрства міру".

З гэткай цікаўнай прапазіцыяй — стварэньня асобнага „Міністэрства міру" выступіў канадцкі пасол Макфэйль у парляманьце. Пасол даводзіў, што тыя грошы, якія цяпер марнуюцца на збраеньні краю, выгадней скіраваць на прапаганду і арганізацыю агульнага міру. Ці трэба дадаваць, што галава ўраду ў адказ на нячуваны праект заявіў, што ўрад вельмі сымпатызуе шляхотнай ідэі аратара, але нажаль павінен выказацца проці яе ажыцьцяўленьня — хаця-б дзеля таго, што новае міністэрства... толькі перашкаджала-б і без таго добра працуючаму—міністэрству загранічных спраў. Вось—што праўда, дык праўда: толькі-б перашкаджала...

Канец „нафтавай вайны" паміж Злуч. Штатамі і Мэксыкай.

Прэзыдэнт Мэксыкі Каллас вярнуў сілу ўсім законам, рэгуляваўшым дабычу нафты ў краі, якія яго ўрад нядаўна скасаваў, жадаючы вырваць нафтавую прамысловасьць Мэксыкі з рук апанаваўшага яе цалком амэрыканскага капіталу. Як ведама,—з-за гэтай барацьбы мэксыканскага ўраду за нацыяналізацыю галоўнага багацьця краю—нафтавай прамысловасьці — амаль не ўзгарэлася фармальная вайна між Мэксыкай і Штатамі. Вайна такі-ж шла — пад тым ці іншым відам: амэрыканцы падтрымлівалі грашмі і аружжам паўстанцаў у краі; апаноўвалі драбнейшыя рэспублікі-суседнія ды саюзныя з Мэксыкай, білі па краі — і мячом і далярам. — Шкодзілі, як толькі маглі. Урэшце Мэксыканскі ўрад ня вытрымаў няроўнай барацьбы з магутным суседам і здаў яму найважнейшую дзяржаўна-гаспадарчую пазіцыю, галоўны свой козыр—нафту.

Перагляд справы нямецкіх адшкадаваньняў у Нью-Іорку.

З Нью-Іорку даносяць, што тутака распачаліся перагаворы паміж дзяржавамі ў справе ўрэгуляваньня нямецкіх адшкадаваньняў і міжсаюзьніцкіх ваенных даўгоў. Як ведама, дагэтуль Амэрыка рашуча адмаўлялася злучаць ды зьвязываць абедзьве гэтыя справы, што якраз дамагаліся заўсёды рабіць эўрапэйскія крэдытары Амэрыкі. Бо-ж яны даводзілі, што здолеюць сплаціць свае ваенныя даўгі Амэрыцы толькі тады, калі ім самім сплацяць ваенныя адшкадаваньні немцы. Але Амэрыка не хацела ставіць пад такі няпэўны варунак сплату даўгоў з боку сваіх саюзьнікаў. Дык цяпер, відаць, пэўнае паразуменьне асягнута. Апрацаваны плян прадбачыць зьмяншэньне сумы нямецкіх адшкадаваньняў з 132 мільярдаў залатых марак (гэтая сума ўсталена ў „пляне Доўса") на 32 мільярды ўсяго. Далей плян прадбачыць падзел гэтай агульнай сумы на рознага роду даўгі — нямецкай дзяржавы і — парадак сплаты іх — грашмі ці „натурай", ці — таварамі.

Безрабоцьце ў Амэрык. Штатах.

Міністар працы Дэвіс заявіў у Сэнаце, што ў сучасны мамэнт у Злучаных Штатах лічыцца 1 міл. 874 тыс. безработных, тады як 23 міл. 850 тыс. людзей маюць работу. Ад 1925 г. безрабоцьце зьменшылася на 7%. Прычыны безрабоцьця мін. угледзіў у сьцягу стыхійных катастрофаў і значнай іміграцыі (уезьдзе чужаземных работнікаў).

Канфлікт паміж Рымскім Папам і Мусоліні.

Добрыя адносіны паміж Рымскім Папам і Мусоліні ў апошні час зусім папсаваліся. Папа — прымаючы венскага кардынала, які скардзіўся яму на гвалты італьянскага ўраду над нямецкай—каталіцкай меншасьцяй у італьянскім Тыролі (адабраным ад Аўстрыі), вельмі востра выказаўся проці гэткай палітыкі Мусоліні, дадаўшы з сумам, што ён, Папа, як сталы „вязень італьянскага ўраду" ў Ватыкане, бяссільны што-небудзь зрабіць

для церпячых каталікоў у Тыролі. Гэтыя словы Папы страшэнна абурылі Мусоліні. А некалькі дзён перад тым — на касьцельнай урачыстасьці ў Ватыкане Папа сказаў вялікую прамову, востра скіраваную проці фашыстаўскага ладу. У гэтай прамове Папа выказаўся проці фашыстаўскай сыстэмы ўзгадаваньня моладзі, як — шкоднай з усіх пунктаў гледжаньня. Папа выразіў жаль, што адбываючыся адначасна зьезд „нацыянал-каталікоў“ (фашыстаў) нетактоўна выражаецца аб яго асобе і г. д. Мусоліні быў настолькі раззлаваны гэтай прамовай Папы, што забараніў яе распаўсюджаньне па ўсей Італіі.

Гэты разрыў з Папай выбівае з-пад фашызму адну з яго мацнейшых падпораў, дык можа каштаваць яго павадыру вельмі дорага. Запраўды-ж — калі кароль і Папа — проці Мусоліні, дык у кожным разе ня можа быць ужо ніякай мовы аб нейкай „суцэльнасьці“ ды „агульна-нацыянальнай сіле“ фашызму: „манархічнае і каталіцкае сумленьне“ значнай часткі італьянскага народу — расколе у кавалкі тую „гранітную скалу“ фашызму, на якой Мусоліні ўгрунтаваў сваю даўно ўжо нячуваную ў Эўропе асабістую дыктатуру.

„Больш, як сэнсацыйная вестка“.

Парыжская прэса зьмяшчае „больш, як сэнсацыйную вестку“ — аб тым, быццам італьянскі кароль мае адрачыся ад трону — з прычыны сталага канфлікту з Мусоліні. Ведама даўно, што Мусоліні, звонку аказываючы належную пашану каралю, увапраўднасьці цалком апанаваў караля ды зусім ня лічыцца навет з канстытуцыйнымі правамі манарха. Кароль цярпіць усё, але ня можа дараваць фактычнаму дыктатару краю яго пагрозы, кінутай каралю яшчэ ў першы год перамогі фашызму, пагрозы — скінуць караля з трону, калі ён ня будзе пакорны Мусоліні. Але справа пагаршаецца шмат — тым, што наступнік трону адносіцца да Мусоліні ўжо зусім без усялякага страху ды бяз усякай пашаны. Газэты ўспамінаюць аб нейкім таямнічым выпадку між ім і Мусоліні, на якім быццам Мусоліні быў ранены. Дык цяпер ідуць чуткі, быццам цярпліваосьць караля Віктара Эмануэля лопнула, і ён пастанавіў зрачыся трону на карысьць сына, які — страшэнна варожа адносіцца — як да Мусоліні, такcама і да фашызму наагул. Быццам кароль хоча прычапіцца да таго, што Мусоліні, правёўшы свой новы „выбарны закон“, фактычна цалком скасаваўшы парлямант, грунтоўна нарушыў канстытуцыю, якой канстытуцыйным ахоўцам зьяўляецца кароль. Гарачая, пратэстуючая — проці нарушэньня канстытуцыі — прамова старога дзяржаўніка — парлямантарыста, Джолітті на паседжаньні „парляманту“ — проці гэтага новага „выбарнага закону“ — быццам так усхвалявала караля, што ён пастанавіў выступіць проці Мусоліні і з гэтай прычыны.

З другога боку, францускія палітычныя колы ня вераць у адмову караля ад трону, але ўсё ж сьцьвярджаюць завастрыўшыяся адносіны яго з Мусоліні, якому кароль можа нарабіць яшчэ шмат клапотаў.

Магчымасьць новага канфлікту паміж Італіяй і Югаславіяй.

Напружанасьць адносінаў паміж Італіяй і Югаславіяй, ня гледзячы на ўсе высілкі англійскай і францускай дыплёматыі, ніяк ня можа зьмяніцца ў спакойным кірунку. Нядаўна белградзкая прэса пусьціла сэнсацыйную вестку аб тым, быццам на югаслаўскай граніцы затрымана 22 вагоны з новай партыяй вайсковай кантрабанды — з Італіі ў Румынію. Як аказалася, вестка была фальшывай. Але яна страшэнна абурыла палітычныя колы ў Італіі. Але на гэтым — не канец: з Белграду ідуць весткі, быццам сьледзтва ў справе гэтай фальшывай весткі высьветліла, што аўтар фальшывага даносу зьяўляецца італьянскім шпіёнам, які ўмысна зрабіў гэты данос, каб справакаваць пагоршаньне адносінаў паміж Італіяй і Югаславіяй. У Белградзе, як пішуць газэты, усе перакананы, што Мусоліні ўсьцяж шукае выгаднага выпадку, каб зарваць дыплёматычныя зносіны з Югаславіяй. А гэтае імкненьне да завастрэньня адносінаў з Югаславіяй тлумачыцца жаданьнем Італіі — за ўсялякую цану загарнуць сабе Альбанію. Так піша венская прэса.

Крывавая бітва сацыялістаў з камуністамі ў нямецкім парляманьце.

Паседжаньне нямецкага парляманту 29 сакавіка — у канцы яго жыцьця — перад новымі выбарамі — закончылася крывавай бойкай паміж сацыялістамі і камуністамі. Прычынай сутычкі зьявілася прамова сацыялістычнага пасла Лянзбэрга — у справе амністыі, — які востра зачапіў камуністаў. Тады паслы — камуністы кінуліся да аратара, да якога на падмогу падбеглі яго таварышы, і пачалася патасоўка, у рэзультаце якой — некалькі паслоў з абодвух бакоў пакалечана да крыві. Старшыня зрабіў перарыў, пасьля якога камуністычны пасол Ядаш быў выключаны на 1 паседжаньне. Калі той адмовіўся пакінуць салю, старшыня выключыў яго на 8 паседжаньняў. А калі не памагло і гэта, тады паседжаньне было адкладзена да другога дня.

Дэманстрацыі чэха-славацкіх работніцкіх арганізацыяў.

У Чэха-Славакіі ўсьцяж адбываюцца лічныя дэманстрацыі работніцкіх арганізацыяў (як сацыялістычных таксама і камуністычных) — проці новага закону аб сацыяльнай ахове работнікаў, які значна пагаршае папярэдні закон. Шмат дзе ў фабрычных местах абвешчаны забастоўкі пратэсту. Асабліва лічныя дэманстрацыі адбыліся ў сталіцы, дзе дайшло да крывавых сутычак работнікаў з паліцыяй, у часе якіх ранена 6 работнікаў і 18 паліцыянтаў. Сацыялістычная партыя выдала адозву, у якой дамагаецца безадкладнага склікаваньня парляманту, каб пацягнуць урад да адказнасьці за здарэньні і ахвяры. Наадварот буржуазныя партыі, уваходзячыя ў склад ураду, дамагаюцца ад апошняга рашучых мераў проці дэманстрацыяў работнікаў.

Пэнсіі (эмэрытуры) для пасло́ў у Бэльгіі.

Бэльгійскі парлямант прыняў закон, паводле якога пасол, пасьля 10-летняй парлямантарнай працы, мае права атрымаць ад дзяржавы эмэрытуру. Разьмер эмэрытуры — ад 6 да 10 тысячаў франкаў.

Нямецкія палякі скардзяцца Лізе Нацыяў.

З Катовіцаў пішуць, што саюз палякаў, пражываючых у нямецкай частцы Сілезіі, зьвярнуўся па тэлеграфу да Лігі Нацыяў з скаргай на прасьледаваньні, якія церпіць польская меншасьць у Нямеччыне. Саюз просіць Лігу прыняць польскае насяленьне ў Сілезіі пад сваю абарону.

АДОЗВА

Беларускага Пасольскага Клюбу „Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“.

СЯЛЯНЕ і РАБОТНІКІ!

Сойм на паседжаньні 31 сакавіка прыняў аднагалосна пастанову аб вызначэньні „Надзвычайнай Камісіі“ па прагляду ўсіх надужыцьцяў, якія зроблены ў часе апошніх выбараў. Камісія павінна будзе ў працягу трох месяцаў аб'езьдзіць усе мясцовасьці і пры сьведках дасьлядзіць правільнасьць пратэстаў, якія йдуць з усіх канцоў Польшчы.

Каб справа мела лепшы вынік, Клюб „Змаганьне“ зварочваецца з заклікам рабіць пісьменныя акты ўсіх зробленых надужыцьцяў у двох экзэмплярах і адзін з іх пакінуць для падачы камісіі на мясцох, а другі перасылаць у Клюб. Гэта дасьць Клюбу падставу з большым правам дабівацца лепшага прагляду справы і прынясе бязумоўна лепшыя вынікі.

Усе гэтыя акты павінны быць падцьверджаны сьведкамі, а подпісы іх па магчымасьці пасьведчаны належнымі ўладамі (гміна, натарыюс і г. д.).

Апрача таго, Клюб зварачваецца з заклікам прысылаць у канцылярыю Клюбу аб усіх крыўдах, якія Вам робяцца, каб злажыць у Сойме належны ўнёсак ці інтэрпэляцыю.

Часовы адрас канцылярыі Клюбу: Białoruski Poselski Klub „Zmaganie za interesy włościan i robotników“ — Wilno, Wileńska, 12—6.

Беларускі Пасольскі Клюб „Змаганьне“.

Наша хроніка.

Дапамога бедным дзеткам сялян і работнікаў Зах. Бел. у суме 1.530 ам. дал. У мінулым тыдні Белар. Камітэт Помачы пацярпеўшым ад Вайны ў Вільні атрымаў ад Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжа ў Менску ліст наступнага зьместу:

„Беларускае Т-ва Чырвонага Крыжа. Цэнтральны Камітэт, Менск, вуліца Карла Маркса. 29. III. 1928 г. № 597.

Беларускаму Т-ву Пацярп. ад Вайны, Вільня, Вострабрамская 9.

Паважаныя Таварышы.

23 сакавіка 1928 г. мы пераялі Вам тэлеграфна на карысьць бяднейшых дзяцей 1.530 ам. дал. (тысячу пяцьсот трыццаць амэрыканскіх даляраў). Перавод зроблены праз Дзяржаўны Банк у Менску на імя Міхаіла Пяткевіча ў Вільні.

Пераведзеная сума складаецца: 1) з чыстага прыбытку ад грамадзкага канцэрту-вечара, які быў уладжаны 23.I. 1928 г. на карысьць дзяцей бяднейшых рабочых і сялян Заходняй Беларусі (афіша паслана Вам 20. I. 1928 г., справаздачу аб вечары глядзі „Савецкая Беларусь“ № 31 ад 5. II.—28 г.); 2) з сумы, вылучанай на тую ж мэту Цэнтральным Камітэтам Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа.

Атрыманьне пераводу будзьце ласкавы нам пацьвярдзіць.

Нам. Старшыні ЦК (—) Цьвікевіч.

Кіраўнік Спраў (—) Кузьмінскі.

Успомненыя грошы Камітэт Помачы Пацярпеўшым ад Вайны атрымаў у пералічэньні на злотыя, бо аддзел Польскага Гандлёвага Банку, праз які гэтыя грошы былі атрыманы, зажадаў даць пакнітаваньне аб атрыманьні грошы ў далярах, а грошы выдаў у злотых.

Беларускі Камітэт Помачы Пацярпеўшым ад Вайны прыносіць шчырую падзяку Таварыству Беларускага Чырвонага Крыжа ў Менску ад імя бяднейшых сялян і работнікаў Заходняй Беларусі за так значную і так патрэбную матэрыяльную дапамогу іх бедным дзеткам.

Старшыня Камітэту (—) Савіцкі.

Сэкрэтар (—) Лукашэвіч.

Ад Рэдакцыі. Ня толькі Камітэт Помачы Пацярпеўшым ад Вайны можа выказваць шчырую падзяку за такую вялікую дапамогу бедным дзеткам Заходняй Беларусі, усё беларускае грамадзянства Заходняй Беларусі, як толькі даведаецца аб гэтым, будзе ня менш удзячна Таварыству Беларускага Чырвонага Крыжа ў Менску. Ведама, што дапамога гэта ад Белар. Чырвонага Крыжа ня першая, у восень 27 г. Камітэт атрымаў 2.560 дал. Калі глянуць на тое палажэньне, у якім знаходзяцца бедныя беларускія дзеткі Заходняй Беларусі, то цэннасьць гэтай дапамогі павялічыцца яшчэ больш, бо-ж, апрача ахвяр самога беларускага грамадзянства праз Камітэт Помачы Пацярпеўшым ад Вайны і Дабрадзейнае Т-ва, іншых крыніц для дапамогі бедным дзецям ня існуе. Хто стаіць бліжэй да беларускага інтэрнату пры Віленскай Беларускай Гімназіі, той ведае, як жывуць дзеці ў гэтым інтэрнаце і прытулку. А колькі-ж ёсьць дзетак бедных па-за прытулкам і інтэрнатам. Але і гэты прытулак і інтэрнат не атрымоўвае амаль-што ніякай дапамогі ад тутэйшых урадовых і мястовых установаў, у той час, як цэлы сьцяг польскіх інтэрнатаў і прытулкаў атрымоўваюць значную дапамогу ад розных установаў і рознымі спосабамі. Дык дапамога бедным беларускім дзеткам ад Таварыства Беларускага Чырвонага Крыжа ў Менску прыходзіць як-раз у час.

Канчаючы сваю заметку, ня можам не спыніцца на паданым тут факце, што Аддзел Польскага Гандлёвага Банку ў Вільні ні за-што не хацеў аддаць пераказанай сумы ў далярах і перадаў яе ў злотых, тлумачачыся тым, што такі загад прышоў з Варшавы ад Цэнтралі. А вы, як сабе хочаце, хочаце бярыце грошы ў злотых, хочаце не бярыце. І ў дабавак выплаціў Банк пераказаную суму ў польскіх злотых па 8 86, а не па курсу, дзякуючы чаму Камітэт страціў зл. 50. Чаму гэта так?

Маемасьць былага Грамадзянскага Сабраньня перададзена Белар. Дабрадзейнаму Таварыству. 27-га сакавіка адбыўся агульны сход былага Грамадзянскага Сабраньня дзеля ліквідацыі маемасьці апошняга. Па пастанове большасьці прысутных на сходзе вынесена была рэзалюцыя, каб маемасьць б. Грамадзян. Сабраньня перадаць Белар. Дабрадзейнаму Таварыст. Гэта пастанова вельмі была не да спадобы Валэйшу, дзеля чаго ён пратэставаў проці яе. Што Валэйша пратэставаў, то гэта і ня дзіва, але аказалася, што і прысутныя на сходзе сельсаюзьнікі таксама галасавалі проці таго, каб маемасьць сабраньня перадаваць Беларускаму Дабрадзейнаму Таварыству.

Лік безработных у Вільні ўсё павялічваецца. Паводле апошніх дадзеных Дзяржаўнага Ураду Пасрэдніцтва Працы, на віленскім груньце зарэгістравана 4.811 безработных. Такім чынам лік безработных узрос яшчэ на 9 асоб. А колькі-ж іх незарэгістраваных?

Ахвяры на карысьць Віл. Бел. Гім. сабраны вучнем III кл. Янкам Сворнякам у час Каляд у вёсцы Яцечы, Лашанскай воласьці — 7 зл., а вёс. Каленькі тэй-жа гміны — 5 зл. 70 гр. Шчырая падзяка ўсім ахвярадаўцам.

Павялічэньне беларускага друку. У Вільні выйшла яшчэ адна новая газэтка ў беларускай мове „Земляроб“, (тыднёвая гаспадарчая газэта), выдаўцом і адказным рэдактарам якой зьяўляецца нейкі Ян Забароўскі.

Газэтка стараецца пераканаць беларусоў у неабходнасьці галасаваць за № 1 беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам. Каб заахвоціць больш сялян да чытаньня, газэтка навет мае гаспадарчы аддзел. Па зьместу і стылю артыкулаў відаць, што ў ёй супрацоўнічаюць віленскія беларускія „фахоўцы“ па грашовым справам. Выгаду мае вёска, — закідаюць яе паперамі з усіх бакоў. Перадаюць, што ў Горадні выйшла газэта падобнага-ж кірунку ў беларускай мове „Стрэха“.

Капітуляцыя „Беларускага Дня“ перад астаўшыміся Паўлюкевічаўцамі. Як ведама, „Беларускі Дзень“ ня так даўно яшчэ пакаваў від, што змагаецца з Паўлюкевічам, як шкодным беларусам і з яго „Беларускім Словам“. Такую ж самую пазіцыю хацеў заняць „Б. Д.“ і да наступнікаў Паўлюкевіча, што нядаўна пачалі выдаваць „Грамадзяніна“. У адным з нумароў „Б. Д.“ у артыкуле „Хто яны такія“ раскрывалася шулерня, застаўшаяся, як спадчына ад Паўлюкевіча на чале з Тодарам Вярнікоўскім. Але хутка рызыка „Б. Д.“ перайшла ў поўную капітуляцыю. Так у № 12 (54) „Б. Д.“ знаходзім такую папраўку:

ПАПРАЎКА.

Дзякуючы недагляду рэдакцыі, у № 11 „Бел. Дня“ папаў артыкул, пад загалоўкам „Хто яны такія“?, якому не магло быць месца на старонках „Бел. Дня“, вось дзеля якіх прычын:

1) Пасьля выхаду са складу арганізацыяў, згуртаваных каля „Бел. Слова“ Д-ра Паўлюкевіча, працай каторых ён кіраваў фактычна, ня можам ідэнтыфікаваць новапаўстаўшую часопісь „Грамадзянін“ з нядаўна памёршым „Бел. Словам“.

2) Да часу, пакуль „Грамадзянін“ ня выявіў яшчэ ў поўнай меры свайго палітычнага і грамадзкага воблiку, ня маем маральнага права ня верыць у шчырасьць яго пачынаньняў.

3) Для ацэнкі маральных кваліфікацый людзей, згуртаваных каля „Грамадзяніна“, ня мог „Бел. Дзень“ апірацца на пісьмах Л. Міцькі і Мацея Пятровіча, у якіх яны выліваюць памыі на Д-ра Паўлюкевіча і адначасна лаюць і яго супрацоўнікаў, бо-ж пісьмы гэныя былі рэзультатам асабістых парахункаў паміж Паўлюкевічам — з аднаго боку, а Л. Міцько і М. Пятровічам — з другога боку і дзеля гэтага могуць зусім мінацца з праўдай.

Рэдакцыя.

Так, трэба адзначыць, што недагляд вельмі паважны, дзякуючы яму „Б. Д.“ мусіў зусім зьмяніць свае адношаньне да Паўлюкевічаўшчыны, якія па сваей сутнасьці зусім не зьмяніліся. Праўда, Паўлюкевіч выступіў, але-ж астальныя ўсе засталіся. Дык мусіць іншыя прычыны змусілі „Б. Д.“ зьмяніць адношаньне да Паўлюкевічаўцаў. Можа яму паківалі зьверху? А можа самі Паўлюкевічаўцы, згуртаваныя каля „Грамадзяніна“, прымусілі „Б. Д.“ зьмяніць да іх адношаньне? Бо-ж ня так даўно хадзілі па Вільні пагалоскі, што яны хацелі зрабіць напад на „Б. Д.“, мабілізаваўшы ўсе свае сілы пад павадырствам самога Вярнікоўскага. Ці адбыўся гэты паход, ці не і якія яго вынікі — не ведама, факт толькі той, што хутка пасьля гэтых чутак у „Б. Д.“ зьявілася працытаваная тут папраўка.

Беларуская Гімназія плямай у воку... беларускіх хадэкаў з „Крыніцы“... У „Белар. Крыніцы“ № 23 зьмешчана заметка пад такім загалоўкам: „Сеці на беларускую моладзь“. І што-ж Вы думаеце, у заметцы гэтай гаворыцца, што гэтыя сеці на беларускую моладзь знаходзяцца ў Віленскай Бел. Гімназіі, якая ўсімі спосабамі хоча перацягнуць гэтую моладзь у мэтадызм. Цьверджаньне гэта аўтар заметкі апірае на тым, што інспэктар гімназіі Д-р Марцінчык быццам быў на арганізацыйным сходзе скаўтаў. Аб інспэктары Марцінчыку не патрэбуем тут нічога казаць, бо ў зьмешчаным у гэтым нумары лісьце ён сам высьвятляе гэтую справу. З сумам мусім падкрэсьліць, што „Беларуская Крыніца“ прадаўжае сваю шкодную беларусам работу пры помачы падцкоўваньня. У свой час „Крыніца“ вяла сыстэматычнае падцкоўваньне проціў „Грамады“, калі тая яшчэ была жыва, пасьля проці грамадзяніна Луцкевіча Антона, пакуль той не апынуўся на лаве падсудных у працэсе „Грамады“ і ўрэшце, калі няма мусіць да каго больш чапіцца, — дык „Белар. Крыніца“ пачала паход на Віленскую Беларускую Гімназію. Наступ на Гімназію „Беларуская Крыніца“ робіць ужо ня першы раз, бо ня так яшчэ даўна пісала аб тым, што ў Віленскай Беларускай Гімназіі моладзь выхоўваецца ў адным і то пэўным палітычным напрамку. А цяпер вось ужо новы закід, што гімназія зьяўляецца рассаднікам мэтадызму і расстаўляе сеці на беларускую моладзь. Апошні закід „Б. К.“ робіць, відаць, таму, што некалькі вучаніц гімназіі знайшлі сабе прыпынак у інтэрнаце, арганізаваным амэрыканкамі. Але гісторыя гэтага інтэрнату вельмі доўгая, пачатак свой яна мае яшчэ ў мінулым годзе і гэта пэўне-ж ведама таксама паном з „Б. К.“, як і ведама пэўне-ж і адношаньне да справы інтэрнату Віленскай Беларускай Гімназіі і Т-ва Беларускае Школы. Дырэкцыя і Пэдагогічная Рада Гімназіі аднеслася адмоўна да арганізацыі інтэрнату, а Т-ва Беларускае Школы таксама адкінула прапазіцыю амэрыканак на арганізаваньне інтэрнату. Як адна, так і другая ўстанова прадбачылі, што з інтэрнатам будзе зьвязана конфэсыйная справа якая зьяўляецца вельмі дражлівай і адносіцца больш да бацькоў дзяцей, чым да Гімназіі ці Т-ва Бел. Шк.

За такое адношаньне да інтэрнату пачалася на Гімназію атака „Белар. Дня“, які цьвердзіў, што ў Гімназіі пануе клерыкалізм і нетолерантнасьць і што з гэтай прычыны бяднейшыя беларускія вучаніцы мусяць пазбавіцца ад прапанаванага ім амэрыканкамі прыпынку. За „Беларускім Днём“, карыстаючы з аказіі, што Гімназію можна прышпіліць, пачаў пісаць і „Кур. Віленьскі“, які ня зьмесьціў пісьмо Дырэкцыі Гімназіі, высьвятляючае тактычны бок справы інтэрнату. Але гімназія не паддалася гэтым нападкам і не зьмяніла свайго адношаньня да інтэрнату. І ўсё-ж інтэрнат паўстаў, дзякуючы прыватнай ініцыятыве. Знайшліся бацькі, што захацелі скарыстаць з прапазіцыі амэрыканак і паслалі ў інтэрнат сваіх дзяўчат. Дык што-ж мае рабіць Гімназія з гэтай прычыны? „Бел. Крыніцы“ хацелася б можа, каб гімназія павыкідала дзяўчат, што пайшлі жыць у інтэрнат па пастанове іх бацькоў, ці можа перасьледаваць іх якімсь іншым спосабам. На жаль „Б. К.“ Гімназія ні аднаго ні другога зрабіць ня можа, ня мае на гэта ніякага права ні маральнага ні фактычнага навет і тады, калі-б інтэрнат быў сапраўды матодыстычным, а вучаніцы, жывучыя ў ім, сапраўднымі мэтадысткамі.

І гэта ўсё вельмі добра ведама паном з „Б. К.“. Дык чаму ж яны робяць нападкі на Гімназію і за што? Каму гэта патрэбна, каму гэта карысна? Каму хочаце і перад усім нашым ворагам, але толькі не Гімназі[і]

і не беларусам. „Дзеньнік Віленьскі“ ужо скарыстаў з акавіі і падхапіў заметку „Б. К.“, а „Беларускі Дзень“ і „Кур. Віл.“ яшчэ перш рабілі на гімназію, праўда зусім з процілеглага боку.

Дык няўжо-ж „Беларуская Крыніца“ хоча быць падобрахвотам „Дзен. Віл.“ і яму падобных? Няўжо-ж „Крыніца“ хоча згуляць тую самую ролю ў адносінах да Гімназіі, якую згуляла яна ў свой час у адносінах да „Грамады“ і да Антона Луцкевіча?

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Дазвольце праз паважаную Вашу газэту выясьніць наступнае.

„Біел. Крыніца“ ў № 23 з дня 30-га сакавіка 1928 г. зьмясьціла непраўдзівую вестку, што быццам „у нядзелю 25-га сакавіка сёл. года адбылося сабраньне некаторых вучаніц гімназіі ў інтэрнаце мэтай арганізаваньня скаутаў. На гэтым сабраньні былі прысутны некаторыя вучыцялі Віленскай Беларускай Гімназіі на чале з інспэктарам грам. Марцінчыкам“.

І далей „Біел. Крыніца“ з гэтага робіць „свае“ неспадзяваныя вывады.

У сапраўднасьці-ж было так: 25-га сакавіка былі імяніны некалькіх вучаніц Віл. Белар. Гімн., праживаючых у інтэрнаце мэтадыстаў. На гэтыя імяніны я, як і некаторыя мае калегі-вучыцялі, і быў запрошаны,—як асоба прыватная. Ніякага-ж „арганізаваньня скаутаў“ там не было.

Пашкадаваць прыходзіцца, што „Біел. Крыніца“ прылучаецца да тых, асьведамлена ці на напраўдзе, паходу проці Беларускіх Гімназіяў, які у апошнія часы арганізуецца цёмнымі сіламі, як у віленскай польскай, так казённай беларускай прэсе.

З пашанай:
Інспэктар Віл. Бел. Гімназіі
Д-р М. Марцінчык.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Аблуда.

(Вёска Малеч, Пружанскі пав.).

Закладзеным тутэйшым войтам і кіраўнікам польскае школы кулком моладзі школьнай у вёсцы Малеч часта ладзяцца вечарыны-спэктаклі. Апрача польскіх п'есаў, ставяцца яшчэ беларускія і украінскія. Здавалася-б, чаго лепшага і жадаць. Самі паны нясуць прасьвету у народ, да яшчэ „родную, беларускую“. Але-ж гэта толькі вонкавая старана. Калі добра прыглядзецца да гэтай справы і прасачыць з самага пачатку, а таксама за далейшым бегам яе разьвіцьця, то атрымаем зусім адваротную старану мядалі.

Пачатак паўстаньня гэнай арганізацыі адносіцца да канца 25 году, у каторым была разыграна адна польская п'еса пад загалоўкам „Герод“. Але-ж далей гэнай пастаноўкі не пайшло, бо з паўстаньнем Грамады напыткі далейшай арганізацыі спаўзьлі на нішто, так як моладзь больш цікавілася сваімі роднымі справамі, чым тымі, што былі прывезены з Варшавы. Пасьля ліквідацыі Грамады моладзь засталася ў „разьбітага карыта“. Ізноў жыцьцё пайшло сваім старым шляхам. Гарэлка і нажы выступаюць на першым пляне, вынікам чаго былі шмат-лічныя параненьні адзін другога, навет забойствы на гэтым грунце, як прыклад—забойства аднаго селяніна на вясельлі у вёсцы Вінец. Ворагі-ж працоўных глядзелі на ўсё гэта ды яшчэ сьмяяліся. І стараліся з свайго боку не праміняць нацкоўваньня адзін на аднаго (бо гэта-ж у іх інтарэсах). Забачыўшы, што ўжо можна і ім прыступіць да працы, не трацячы часу, распачалі ўсёлеўную кампанію арганізацыі „Kółka Macierzy Szkolnej“. Але ж так лёгка было зрабіць гэта. Моладзь, хаця і неахвотна, але ішла, гэта было, праз некі прыцягалі войта гміны „Борушко“ закікнуў да сабе некалькі хлапцоў, пачаставаў іх папіросамі, далей гаварыць, што Грамада пасцявала ўсё іх справы, кажа не Грамада, то мы дасталі-б зямлю, грашовую пазыку, лесу на адбудову і яшчэ многа чаго.

Але-ж усё гэта можна яшчэ папраўляць, трэба толькі залажыць „кулко мацежы школьней“. А пасьля гэных некіх слоў пазбу іх (хлапцоў) да абшарніка Сывідзі (які ёсьць на столькі добры для іх селян, што не праміне выпадку садраць з іх астатнюю кашулю). А як прышлі да яго хлапцы з войтам, зараз-жа усадзіў іх на мяккія крэслы і пачаў гаварыць пра цяжкую долю нашага сярмяжнага селяніна, пра яго жыцьцё бедае і як гэта направіць. Муціць, словы абшарніка зрабілі ўплыў на хлапцоў, а можа і спадабаўся ім сам абшарнік са сваімі раскошна прыбранымі пакоямі, ці можа ягоная жонка з дачкою, каторых дэклараваў ён, не адзін тэатральнай трупы, ці можа змануля іх перспэктыва блізкіх адносінаў з такім аніклай асобай, як абшарнік з войтам, — не ведаю. Але-ж, як выйшлі ад абшарніка, то „кулко“ было гатова. І вось з таго часу распачалася праца ў гэтым кірунку. Ставяцца спэктаклі, пра каторых ня варта спамінаць, бо карысьць з іх няма ніякай, а калі і ёсьць якая карысьць, дык напэўна нашым „любезным“ аматарам і іх кіраўнікам, вучыцялям, гмінным ужэндьнікам і іншым, каторыя стараюцца выкарыстаць гэныя спэктаклі дзеля сваіх асабістых мэтаў, бо ўся-ж выручка тут-жа прапіваецца. І тут „гарэлка“ выступае на першае месца. Лік прысутных, што раз змяншаецца, можа хто і пашоў-бы, але-ж баіцца, каб не зарабіць гуза, або штосьці ў гэным родзе. Як прыклад гэнага, можа служыць факт, здарыўшмея пры настаноўцы п'есы пад загалоўкам „Ой не ходы Грыцю“ ў дзень 26.II 28 г. Па адыграньні гэнай п'есы павінны былі адбыцца скокі. Але-ж уперад чым рабіць скокі, удасьнікі трупы са сваім зажовдам зрабілі „папойку“, якая цягнулася каля 3-х гадз. Можа „бавіліся-б“ яшчэ і далей, але не хапіла грошаў. А там праз гэны ўвесь час чакала на іх публіка, бо бяз іх адбывацца скокі не маглі. Публіка пачала ўжо разыходзіцца, як раптам раздаўся крык: „скокі“! Гэта быў голас вярнуўшыхся п'яных аматараў. Так, як вярнуўшыяся п'яныя аматары распачалі выяўляць свае п'яныя здольнасьці, пад час чаго пайшлі ў ход нажы, публіка, чуючы сябе небясьпечна, пачала уцякаць, як можна. Такі слаўны канец быў гэнай вечарыны. Вось да чаго даводзіць панская „прасьвета“. Замест свабоднага разьвіцьця, мы бачым на кожным кроку яд, тую атруту, якою затручваюць паны галовы працоўным вёскам. Моладзь! Пара ўжо зразумець, куды гэта вядзе. Закладайце сваю прасьвету. Закладайце гурткі Т-ва Белар. Школы, якія заўсёды стаяць на культурна-асьветным груньце.

Вяскор.

Нарэшце пазбавіліся.

(Вёска Кляшчэлі, Бельскага павету).

Дачакалася ўрэшце ўжо і наша гміна пазбыцьця свайго апякуна п. Собка, які так пільнаваў спакойны працоўны люд, усе стараннасьці прыкладаў, каб агаліць яго, а таго пэўна і не прымеціў, як пусьціў некалькі тысяч мазольных, потам і сьлёзмі аблітых людзкіх грошаў. Як на гэта паглядзяць тыя, каму ён даносіў, няўжо-ж і цяпер паверацць п. С., або да яго падобных іхнім даносам, як гэта п. С. пляміў кожнага добрасумленнага грамадзяніна для свае́й нажывы і кар'еры, а яшчэ лічыў сябе патрыётам і прыкладным пісарам. Есьць чуткі, што п. С. ня мог перанясьці бяды, якая на яго ўпала, як хмара, бо некалькі гадоў быў ён пісаром магістрату і гміны, трымаючы шмат памочнікаў, а тут раптам здарэньне і ад пана Собкі уцякло палова грошы, а так, як ён жыў на шырокую пышнасьць, да якое прывык хіба-ж у нас, бо прыехаў калісь сюды чуць з духам, на што стала можа і кусо з аднэй гміны, дый пэўна спадзяваўся на лепшую пару, дык браў пацíху пазыкі. Вось чаму і ўсе стараньні дадаваў абы ў кандыдаты на войта папаў хто з яго бліжэйшых, а ня з тых, каго запраўды выбраў народ. Гэтым разам памагло п. С. ня надта, бо калі першы кандыдат з выбраных не папаў на свае́ мейсца толькі па апініі п. С. аб якую так доўга стараўся, а ўсё такі астаўся войтам другі кандыдат — чалавек працоўны, маральнасьцю далёкай ад п. С., які адразу ўбачыў гэтую махінацыю і да якой прыступіў добрасумленна, за што пэўна з агулу працоўных ня знойдзецца такога, хто ня выразіў-бы яму „шчырае дзякуй“.

У будучым спадзяюцца, што можа ад падобных апякунаў, як п. С. адтрасуцца, а працоўны грош будзе ўжыты для дабра ўсяго агулу, дый усе павіннасьці будуць разложаны справядліва, а не як за п. С., які чамусьці лічыўся ўсемагутным.

Шчыры.

Прызнаўся, за чым езьдзіць.

(Крывіцкае вол., Вялейскага павету).

Як хутка ўсё мяняецца... Яшчэ летась поп Крывіцкага прыходу Ракецкі езьдзіў „па калядзе“, „стараўся“ сьвянціць нашыя хаты, пяяць пацеры, каб у нашых хатах ня было „нячыстае сілы“. А сёлета ён ужо не паехаў „па-калядзе“, сёлета ён ужо перастаў „старацца“. Чаму-ж ён сёлета нас „не шкадуець“, — ня гоніць „нячыстае сілы“ з нашых хатаў? Бо абышліся з ім летась „не палюдзку“, аб чым ён сказаў царкоўнаму старасту, калі той запытаўся:

— Чаму, бацюшка, сёлета „па-калядзе“ ня езьдзілі?

— А чаго я паеду, если ничего не дают? З деревни трох фунтов ржи не сбереш,— гэтак шчыра „баця“ Ракецкі прызнаўся, за чым ён езьдзіць.

Брава „баця“! Лепш шчыра і проста, бо ўсёроўна селянін ужо знаў, за чым вы езьдзіце. Селянін ужо не цям-цялям.

Г. Ч.

Спэктакль у м. Казянах.

(Браслаўскага пав.).

Рух нацыянальна-сацыяльны ахапіў усе куткі беларускай вёскі. Мала мясцовасьцяў, дзе б барацьба за вызваленьне не даходзіла. Там, дзе нядаўна загнаны беларус ня ведаў, што ён ёсьць і кім павінен быць, дык цяпер голасна падняў дамаганьне на самастойнае жыцьцё, да будаваньня сваёй будучыні. Як прыклад, м. Казяны.

7. I. 28. адбыўся беларускі спэктакль у ўспомненым мястэчку, ладжаны Т-вам Бел. Школы. Пьеса „Паўлінка“ Я. Купалы, якая ставілася, (ня гледзячы на вясковую моладзь) адыграна была вельмі добра. Праўда, былі заганы ў пастаноўцы сцэны, але гэта кожны можа зразумець з абставінаў вёскі.

Разам з гэтым выступаў беларускі хор пад кіраўніцтвам дзячка з царквы м. Казян (прозьвішча якога ня ведаю). Тут крыху горэй вышла справа. У-ва ўсім пяяньні адзначаўся царкоўны матыў і неарганізованасьць. Але гэта нічога. Толькі трэба шчыра прывітаць спачуцьце праваслаўнага духавенства да нацыянальнай справы, якое робіцца ня з боку палітычнага, а з свайго сумленьня да нацыянальнага адраджэньня. Бо шмат ёсьць такіх духоўнікаў, якія, каб пільнавацца сваей справы, выліваюць розную негадзь, бруд на адраджэньне.

Спэктакль-вечарына кончылася танцамі. Ад усяго гэтага стварылася вельмі прыгожае ўражаньне. У-ва ўсіх чулася задаваленьне; толькі той, каму рух нацыянальны шкодны, з пагардай пагляда́ў.

Яшчэ сьпіць наша Моладзь.

(Вёска Плетанігі, Старавейскай воласьці, Слонімскага павету).

Радасна слухаць, як пачнуць гаварыць, што ў м. Азярніцы ладзяцца спэктаклі-вечарыны. Прыемна глядзець, як сабраўшыся старыя і малыя ідуць у Азярніцкую бібліятэчку-чытальню, каб пагутарыць, або паслухаць што не-будзь у беларускай мове. Чэсьць закладчыкам гэтае бібліятэкі! Чэсьць барацьбітам з цемрай! Чэсьць і слава Вам, што Вы верыце ў лепшую будучыню, але вось сумна, калі падумаеш аб нашай моладзі вёскі Плетанічы, а таксама і ў Драповцы Старавейскае гм., якія ўсьцяж сьпяць і чакаюць лепшае будучыні, а можа тую лепшую будучыню будз хтось у кошычку на вёсках насіць.

Не, браткі, ніхто ня дасьць Вам нічога, калі Вы самі сабе не здабудзеце. Няўжо ж Вы ня ведаеце, што Вы ў рукох цемры, якая пануе ў нашых вёсках, — дык схамянецеся, браткі, да працы, уступіце ў тыя рады, якія імкнуцца дзеля здабыцьця асьветы і лепшае будучыні, дайце прыклад маладому пакаленьню, каб яно на Вас не наракала і не паказвала пальцамі, як на адшчапенцаў. Няўжо-ж Вы, браткі, ня чытаеце газэт, няўжо-ж вы ня чуеце, як змагаюцца з цемрай, а можа Вас запалохваюць нашыя здраднікі і ворагі, дык ня слухайце іх! Закладайце запраўдную культурна-асьветную арганізацыю Таварыства Беларуск. Школы, якая Вам пратрэ вочы ад векавечнага сну.

Франкоўская дзяўчына.

Дзеці—для Бацькаўшчыны.

(М-ка Казлоўшчына, Слонімскага пав.).

На другі і трэйці дзень Каляд жыхары мястэчка і блізкіх вёсак пабачылі прыемны абраз. У гэтыя дні Казлавецкім Гуртком Т-ва Бел. Шк. быў наладжаны беларускі спэктакль. Нічога, здаецца, дзіўнага? Гэта іх сотні ладзяць сёньчы! Але на гэты раз ёсьць што адцяміць арыгінальнага. У культурнай працы для свайго працоўнага народу, для яго вызваленьня ад цемры, мы прывыклі бачыць толькі дарослых, на гэты ж раз угледзелі і дзяцей.

Гулялі „Ёлку дзеда Мароза“—калядны вясковы абразок. Хоць кароценькі, але зрабіў вялікае ўражаньне, аб гэтым сьведчыць захопленьне глядзельнікаў і гучныя воплескі. Асабліва вызначалася сваёю гульнёю Клаўдыя Тарасюк. Яна гуляла так натуральна і сьмела, што асабліва захапіла сваёю гульнёю. Напоўнілі салю сьмехам малыя красналюдкі, а сьняжынкі вельмі стройна прапялі сваю кароценькую песеньку. Кароценькі абраз дапоўніла дэклямацыя вершаў, якая прайшла ўдала і захопліваюча.

Уражаньне засталося самае лепшае. Госьці былі поўнасьцю задаволеныя.

Але не спадабалася гэта вучыцялю польскай школы ў Казлоўшчыне.

Як гэта, каб вучні польскае школы дыбралі ўдзел у культурный працы, якую яны завуць „вывротовай“?!

Але няхай не забываецца гэты панок, што школа польская ў Казлоўшчыне істнуе толькі, дзякуючы нясьведамасьці сялян-бацькоў. Калі-ж яны асьвядомяцца і возьмуцца за розум, дык гэтая школа, на падставе існуючых законаў, перарвтарыцца ў беларускую.

Далей гэты панок страшыў тых вучняў выгнаньнем са школы і штрафам.

Дык вось, як змагаюцца з беларускаю культурнаю розныя Галілеюшы.

* * *

Як бачым, рух вызваляючы захапіў у свае рады беднае, замучанае беларускае дзіця. Дзеці кладуць цэглу на будоўлю гмаху беларускае культуры. Дык колькі гэты абраз паддае сілы, энэргіі? Ен крэпіць у тысячы разоў сілы ўжо працуючых, ён застыджвае, захоплівае астаўшыхся звонку барацьбы, прадаўшых душу і цэла ворагу.

Дык чэсьць вам і слава, маладыя барацьбіты за вызваленьне працоўных Беларусі! За вашым прыкладам пойдуць іншыя.

Свой.

Дай дарогу, Паўлюкевіч і Умястоўскі — „вучоны спадар“ Я. Станкевіч ідзе!

(Лідчына).

Янка Станкевіч, атрымаўшы, відаць, шмат грошаў, пачаў аднаасна выдаваць аж дзьве газэты. Апрача „Народу“, які, як кажуць выпушчаны аж у 40.000 экз. лацінікай і кірыліцай — нарадзілася на сьвет яшчэ адна газэціна „Наша Бацькаўшчына“.

Вось на сцэну выйшаў яшчэ адзін новы ламайла (разьбівач) беларускага руху які пакуль-што ў правакацыйны спосаб хаваецца пад маркаю сялянска-работніцкаю. Янка Станкевіч стараецца абмануць працоўныя гушчы рознымі спосабамі і ўжывае характэрныя для яго езуіцкія мэтоды (відаць іх пераняў з каталіцкае духоўнае сэмінарыі, дзе адзін час вучыўся), навет сваю новую газэту „Наша Бацькаўшчына“ ён выдаў у такім самым фармаце і такімі самымі літарамі, як выдаецца і наша газэта. Гэта зроблена не выпадкова, а з вядомаю мэтаю ашуканства. Адным словам, ён усімі спосабамі хоча апрануцца, як той воўк — у авечую скуру.

Каб адвясьці вочы і паказаць, што „Бел. Дзень“ „Бел. Слова“ і „Наша Бацькаўшчына“, гэта не адна фірма — ён навет нападае на Умястоўскага і Паўлюкевіча (яму і гэта дазволена). Страшэнна задаволены, што яго канкурэнты пяюць „лебядзіную песьню“, а ён, Янка, заступае іх месца, як спрытнейшы. Няма фактычна чаго яму ўжо так вясяліцца, трэба з сумам толькі глядзець на гэту страшэнную дэмаралізацыю. Пакланіўся Янка залатому богу і цяпер сам мусіць засьпяваць „лебядзіную песьню“. Даволі будзе таго, што вёска ўжо ведае, адкуль Янка Станкевіч мае грошы (і відаць немалыя) на гэту працу фактычна—ён ужо стаў палітычным трупам і ўсё чэснае беларускае грамадзянства стыдаецца навет падаць яму руку. Так бясслаўна канчае сваё палітычнае і навет грамадзкае існаваньне Янка Станкевіч!

Свой.

Умястоўскага „агітатары“ працуюць.

У наша мястэчка Турэц прыходзіць нейкі „агітатар“ і намаўляе сялян, каб упісываліся да Умястоўскага „крамкі“, бо, як ён казаў, што гэта ёсьць сапраўдная чыстая „беларуская“ арганізацыя. Сяляне няверачы гэтаму „франту“ і, пасылалі яго туды, адкуль ён прышоў. Пасьля кароткай гутаркі, сялянам удалося дазнацца, што як быццам ён паходзіць з суседняе вёскі Пясочнай. І мы скора гэтага пана пазбыліся, выпраўляючы яго з „падсьвістам“. Пасьля пэўнага часу я спаткаўся з адным селянінам з вёскі Пясочнай і запытаўся, што гэта ў іх за пан ёсьць? — той растлумачыў, што гэта ёсьць „канфідэнт“ з сыскной паліцыі і разам з тым належыць да Умястоўскага „крамкі“. Вось дык „праўдзівая“ беларуская арганізацыя! Брава, пане Умястоўскі! Ужо вельмі добра ведаюць вас і вашых інструктараў на вёсцы, што гэта за „арганізацыя“ і надарма вы крычыцё ў сваім „Бел. Дн.“, што за вамі ўсе беларускія сяляне і ваша перамога. Толькі наша сялянства даўно ведае, што вы за „шышкі“.

Вясковы.

З Т-ва Бел. Школы.

Працы Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

× **Вёска Яруцічы, Слонімскі павет.** Яруціцкім Гуртком Т-ва Бел. Школы 8 і 9 студзеня 1928 г. быў ладжаны спэктакль-вечарына; былі адгуляны наступныя п'есы: „Паўлінка“, „Пан міністар“ і „Боты“. Маладыя аматары-артысты свае ролі выканалі вельмі добра, асабліва добра гулялі дзяўчаты. Пасьля чаго была дэклямацыя беларускіх вершаў і скокі. Вечарына закончылася вельмі добра, ня гледзячы на перашкоды некаторых сваіх несьвядомых хлапцоў.

× **Вёска Масілевічы, Дзевяткоўскае воласьці.** Масілевіцкім Гуртком Т-ва Бел. Школы былі ладжаны спэктаклі-вечарыны, на якіх былі адгуляны наступныя п'есы: „Страхі жыцьця“ і „У іншым шчасьці няшчасьце схавана“; глядзельнікаў было шмат і засталіся вельмі задаволены. Падзяка ўсім учасьнікам і запрашае гурток да далейшае культурна-асьветнае працы ўсіх маладых беларусаў нашае ваколіцы.

× Мядзьведзеўскім Гуртком Т-ва Бел. Школы быў ладжаны спэктакль-вечар 2-га студзеня 1928 г.; былі пастаўлены на сцэне наступныя п'есы: „Пасланед“ і „Зьбянтэжаны Саўка“. Пасьля спэктаклю адбыліся скокі.

× **Вёска Острава, Міжэвіцкай воласьці, Слонімскага павету.** Тутэйшым Гуртком Т-ва Бел. Школы быў ладжаны спэктакль-вечарына 19.I 1928 году; былі прыгатаваныя для пастаноўкі наступныя п'есы: „У іншым шчасьці, няшчасьце схавана“ і „Конскі партрэт“, але-ж дзякуючы таму, што стараста ня даў дазволу на першую п'есу, то была адгуляна толькі другая. Публіка была вельмі задаволена і гэтым, аб чым сьведчылі апладысьмэнты. Падзяка ўсім учасьнікам.

Паведамленьне.

Падаецца да агульнага ведама, што білет за № 5245, выданы Т-вам Белар. Школы грам. Валаху Раману з в. Бялавічы, Косаўскага павету — уневажняецца.

Галоўная Управа.

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.